

**Вясёлыя гісторыі ад чытачоў**

СТАР. 7



**Як праходзіць датэрміновае галасаванне**

МС



**Хто ляціць у Лісабон?**

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Усевалад ЯНЧЭЎСКІ, дырэктар Парка высокіх тэхналогій:**

*«IT-індустрыя вельмі тонка адчула добрае і сапраўды шчырае стаўленне дзяржавы. І вось вынік — узята псіхалагічная планка: у мінулым годзе экспарт парка вырас на 25 працэнтаў і ўпершыню ў гісторыі перавысіў 1 мільярд долараў. Ключавы фактар поспеху адзін — ясны сігнал ад Прэзідэнта IT-супольнасці: працуйце свабодна і спакойна, зарабляйце для сябе і для краіны, дзяржава нідзе не будзе перашкаджаць вам, а ўсюды, дзе можа, дапаможа. Гэта поспех не толькі для ПВТ, гэта поспех для ўсёй краіны, бо гэтыя мільярд долараў прыйшоў у Беларусь, у нашу эканоміку. Сёння новы дэкрэт адкрывае новыя магчымасці, а значыць, будуць і новыя поспехі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.02.2018 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9717 ▼ |
| Еўра | 2,4632 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0348 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0735 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

18033

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№ 33 (28649)

16 ЛЮТАГА 2018 г.
ПЯТНІЦА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА

# А СНЕГ ЗУСІМ НЕ ХАЛОДНЫ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзяніс і Юлія ШАСЦЮКІ са сваім хатнім гадаванцам на заснежанай вуліцы старажытнага палескага Давыд-Гарадка.

■ Ракурс

## СЯРЭБРАНАЯ ЭКАНОМІКА: ПАТЭНЦЫЯЛ СТАРАСЦІ

### Але беларускі рынак і аўдыторыя 60+ пакуль яшчэ толькі прыглядаюцца адзін да аднаго...

**Апошнім часам шмат гаворыцца пра старэнне насельніцтва і часта гэтая тэндэнцыя падаецца як праблема. Маўляў, рызыкі для эканомікі, павышаная нагрузка на сацыяльную сферу... Так недалёка і да таго, каб пачаць успрымаць пажылых людзей нейкім баластам, які замінае маладым. Хоць гэта далёка не так. Рост колькасці пажылых людзей нясе і новыя магчымасці — у свеце зараз загаварылі аб так званай сярэбранай эканоміцы, калі ў цэнтры ўвагі знаходзяцца сівавалосыя спажыўцы і пад іх патрэбы падладжваюцца вытворцы тавараў і паслуг. Што дае такі падыход? Дадатковыя працоўныя месцы, павелічэнне спажывання і вытворчасці — гэта значыць, рост эканомікі.**

### Старасць — гэта не мінулае. Гэта цяперашняе!

Старасць нясе ў сабе патэнцыял вопыту і клопату. А яшчэ ў яе ёсць фінансавы патэнцыял. Таму што менавіта пажылыя часта дапамагаюць маладым сем'ям грашыма, калі моладзь страчвае працу. Так было, напрыклад, у ЗША і Еўропе, калі з-за сусветнага крызісу 2008 года пачалося беспрацоўе сярод маладых. Але не трэба недаацэньваць фінансавых магчымасцяў і нашых пажылых людзей. Яны таксама нярэдка дапамагаюць маладым сем'ям — сітуацыя часта менавіта такая, а не наадварот.

Зараз у свеце ўсё больш і больш тавараў і паслуг арыентуецца на людзей трэцяга ўзросту, бо яны складаюць вялікую долю ўсіх спажыўцоў, і гэтая доля пастаянна расце разам з ростам колькасці пажылых людзей. Прычым сёння людзі жывуць не проста даўжэй. Яны ўсё даўжэй застаюцца актыўнымі, а значыць, могуць з'яўляцца актыўнымі спажыўцамі банкаўскіх, турыстычных і іншых паслуг.

СТАР. 4

■ Самазанятасць

## ВЫШЫТАЯ ДОШКА, ЧОРНАГЛЯНЦАВАНЫ ГЛАДЫШ, ТРАВЯНЫ БРАНЗАЛЕТ

### Рамесніцтва сёння — хобі ці спосаб пракарміць сям'ю?



**Віталя Шапялевіча аўтар гэтых радкоў не раз сустракала на «Дажынках», іншых кірмашах і святах Брэстчыны. Майстар з Ганцавічаў прадаваў свае вырабы з гліны: вялікія збанкі і гладышы, а таксама маленькія сувенірныя вазы. Адна з такіх ваз стаіць на маім рабочым стале каля камп'ютара. Відавочна, многія любяць, а таксама набываюць кераміку не толькі ў якасці сувеніраў, але і карыстаюцца ёю як посудам. Таму асобныя з нашых майстроў са свайго рамяства сталі ўтрымліваць сям'ю.**

### На керамічнай аснове

Прыкладам можа служыць сям'я нашага героя. Віталь з жонкай — шматдзетныя бацькі, яны гадуюць сямёра дзяцей. Старэйшы 15-гадовы сын стаў ужо памочнікам бацьку, наступныя па ўзросце сын і дачка таксама асвойваюць ганчарскую справу. Так што будзе каму перадаваць майстэрства. Віталь Леанідавіч у свой час скончыў Мірскае мастацкае вучылішча па спецыяльнасці ганчарская справа. Спачатку працаваў на Гродзеншчыне, потым вярнуўся на малую радзіму. Купіў неабходнае абсталяванне, уладкаваў майстэрню.

СТАР. 5

# МІНСК — АНКАРА: РЭНЕСАНС АДНОСІН

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэм'ер-міністрам Турцыі Біналі Йылдырымам.**

«На працягу некалькіх апошніх гадоў беларуска-турэцкія адносіны перажываюць перыяд рэнесансу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы наладзілі вельмі добрае супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы — а гэта падмурак любых адносін. У нас як ніколі добрыя палітычныя адносіны паміж дзяржавамі. Нашы ведамствы, прынамсі асноўныя, якія вызначаюць беларуска-турэцкія адносіны, знаходзяцца ў цесным кантакце і вельмі добра супрацоўнічаюць, прытым плённа».

Турцыя займае дзявятае месца па аб'ёме тавараабароту ў беларускім знешнім гандлі. Летась гэта лічба дасягнула $942,2 млн. Наша краіна экспартуе калійныя ўгнаенні, стальныя паўфабрыкаты, нафтахімію, сінтэтычныя валокны і іншае. Найбольшую ўдзельную вагу ў экспарце-імпарце паслуг займае транспарт.

На тэрыторыі Беларусі працуе каля 300 суб'ектаў гаспадарання з турэцкім капіталам. Разам з турэцкімі партнёрамі ідзе работа па стварэнні зборачных вытворчасцяў камбайнаў «Гомсельмаш», будаўнічай і спецыяльнай тэхнікі «Амкадор», а таксама па пастаўках на турэцкі рынак тэхнікі БЕЛАЗ.

Кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў выкарыстоўваць напрацаваную базу для нарошчвання адносін і падкрэсліў, што закрытых тэм у нас няма.

Бінаді Йылдырым падзякаваў за гасцінную сустрэчу. Прэм'ер-міністр расказаў, што падчас перагавораў з кіраўніком урада Андрэем Кабяковым атрымалася абмеркаваць шырокае кола двухбаковых пытанняў, а таксама тыя мэты і задачы, якія былі акрэслены ў лістападзе 2016 года на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Таіпа Эрдагана. Спадар Йылдырым таксама перадаў прывітанне беларускаму лідару ад кіраўніка турэцкай дзяржавы.

***

Актуальныя пытанні супрацоўніцтва і перспектывы ўмацавання міжпарламенцкіх сувязяў абмяркоўвалі на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча і старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі з прэм'ер-міністрам Турцыі Бінаді Йылдырымам.

Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на развіццё ўзаемадзеяння дзвюх краін у транспартнай галіне. «Нашы міністры падпісалі пагадненне аб міжнароднай камбінаванай перавозцы тавараў, у гэтым добрая перспектыва, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Акрамя таго, абмяркоўваліся пытанні марскіх перавозак. У лістападзе мінулага года мы дамовіліся з Украінай па пытаннях падтрымкі воднага шляху па Дняпры, каб арганізаваць паўнавартасныя перавозкі рака-мора». Ёсць патэнцыял для развіцця беларуска-турэцкага супрацоўніцтва і ў сферы авіяперавозак, лічыць спікер. Перспектыўным старшыня Савета Рэспублікі назваў партнёрства Беларусі і Турцыі ў галіне стандартызацыі.

У сваю чаргу Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што Беларусь разглядае Турцыю як надзейнага сябра і важнага партнёра. «І нам прыемна, што адносіны паміж краінамі актыўна развіваюцца. Ваш цяперашні візіт — чарговы важны крок на шляху развіцця палітычных, гандлёва-эканамічных, інвестыцыйных сувязяў паміж нашымі краінамі», — дадаў ён.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ФУТБОЛ І БАНКАЎСКІЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў гэтыя тэмы з Сяргеем Румасам, старшынёй праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь і старшынёй асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» (АБФФ).**

Кіраўнік дзяржавы папрасіў ахарактарызаваць сітуацыю ў банку: «Як удалося рэалізаваць задумы, пачынаючы ад лізінгу і заканчваючы кіраваннем сямейным капіталам? Там ужо, па-мойму, сабралася каля паўмільярда долараў. Гэта велізарная сума, і добра, што ў свой час на гэта пайшлі. Гэта грошы, якія сёння працуюць, і яны гарантавана будуць атрыманы адрасатамі: тымі дзеткамі сёння, а заўтра — дарослымі людзьмі, якія могуць траціць іх на адукацыю і іншыя рэчы». Прэзідэнт падкрэсліў, што гэта добрае ўкладанне ў чалавечы капітал.

Таксама Аляксандр Лукашэнка згадаў праграму Банка развіцця «Школьны аўтобус», якая летась завяршылася. У выніку набылі 330 транспартных сродкаў для падвозу дзяцей у сельскай мясцовасці да адукацыйных устаноў. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы спытаў меркаванне Сяргея Румаса наконт сітуацыі на фінансавым рынку.

Старшыня праўлення банка пасля сустрэчы расказаў журналістам, што Прэзідэнт традыцыйна цікавіўся ходам рэалізацыі буйных інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, кіраўніку дзяржавы далажылі аб ходзе будаўніцтва ўзлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Яна будзе ўведзена ў эксплуатацыю ў гэтым годзе. Бетонная аснова ўжо завершана, зараз ідзе закупка абсталявання. Калі надвор'е дазволіць, пачнецца яго мантаж. Летась Банк развіцця прафінансаваў гэты праект на $108 млн.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з ходам кіравання прадпрыемствамі дрэваапрацоўкі. Сяргей Румас адзначыў, што ўжо сёння холдынг выйшаў на прыбытковую работу, большая частка прадпрыемстваў працуе ўстойліва і далей будзе нарошчваць паказчыкі.

Пытанні спартыўнай тэматыкі, а дакладней падрыхтоўку трэнерскіх кадраў і развіццё дзіцяча-юнацкага футбола, Прэзідэнт і старшыня футбольнай федэрацыі абмеркавалі разам з Сяргеем Бароўскім, выкладчыкам трэнерскіх курсаў АБФФ, Юрыем Курбыкам, заснавальнікам кампаніі «МК Інвест», намеснікам старшыні АБФФ, Эдуардам Малафеевым, трэнерам-кансультантам маладзёжных камандаў ФК «Дынама-Мінск», і Людасам Румбуцісам, галоўным трэнерам маладзёжнай зборнай Беларусі па футболе.

Аляксандр Лукашэнка спытаў, ці не сорамна ім за сённяшні стан футбола. Прэзідэнт адзначыў, што курыруе гэты від спорту кіраўнік найлепшага банка, які паспяхова рэалізаваў шмат розных праектаў. «Адзін праект, правалены ім, — гэта футбол. А вы дзе былі?» — спытаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да спартсменаў.

Футбол — гэта самы масавы і любімы від спорту, адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка расказаў, як сам у юнацтве імкнуўся гуляць. Успомніў, як зашываў мяч і клеіў камеру. Тады і «Дынама» было іншым. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, як Юрый Курбыка стаяў на варотах, як Людас Румбуціс гуляў на полі... Чаму зараз гэтага няма? Аляксандр Лукашэнка тлумачыць: «Няма трэнера — няма спорту. Арганізоўваць трэба і пытаць: колькі ты выкрышталізаваў у грамадстве вось такіх хлапчукоў у школьным узросце? Шчэрбу, гімнаста, дзе знайшлі? У дзіцячым садку». Разглядзець талент і дапамагчы яму вырасці — гэта ўжо задача трэнера. Кіраўнік дзяржавы сказаў, што неабходна рэарганізаваць Беларускую федэрацыю футбола і ўзяць пад кантроль трэнераў.

Сяргей Румас расказаў супрацоўнікам СМІ, што кіраўнік дзяржавы выслухаў прапановы, якія датычацца, напрыклад, класаў падрыхтоўкі па футболе ў спартыўных школах. Старшыня АБФФ лічыць, што адзіная методыка падрыхтоўкі юных футбалістаў па ўсёй краіне прынясе вынікі.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У АМЕРЫКАНСКАЙ ШКОЛЕ АДБЫЛОСЯ МАСАВАЕ ЗАБОЙСТВА

19-гадовы Нікалас Круз, які раней быў выключаны за сістэматычнае парушэнне школьнай дысцыпліны, адкрыў агонь з вінтоўкі на тэрыторыі адукацыйнай установы. Вынікам стральбы стала гібель 17 чалавек, прыкладна столькі ж атрымалі раненні. Інцыдэнт адбыўся ў школе ў горадзе Паркленд, які знаходзіцца за 60 км на поўнач ад Маямі. У школе вучацца каля 3 тыс. дзяцей ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Гэта шосты выпадак расстрэлу навучэнцаў школ у ЗША з пачатку 2018 года.

## СІРЫЛ РАМАПОСА АБРАНЫ НОВЫМ ПРЭЗІДЭНТАМ ПАР

Лідар кіруючага ў ПАР «Афрыканскага нацыянальнага кангрэса» Сірыл Рамапоса абраны новым прэзідэнтам краіны на пасяджэнні Нацыянальнай асамблеі. Пасля абвяшчэння вынікаў галасавання, ход якога трансляваўся, у прыватнасці, на Youtube, некаторыя члены парламента пачалі апладзіраваць і танцаваць. Лідар АНК быў адзіным кандыдатам, прапанаваным дэпутатамі, паколькі апазіцыйныя партыі прынялі рашэнне не выстаўляць сваіх прэтэндэнтаў, настойваючы на роспуску парламента і правядзенні датэрміновых выбараў.



## «ЧОРНАЕ ЗОЛАТА» ПАЙШЛО Ў РОСТ

Цэны на нафту павышаюцца, паколькі таварныя запасы «чорнага золата» ў ЗША павялічыліся менш, чым асцерагаліся эксперты, паведамляе CNBC. Кошт красавіцкіх ф'ючарсаў на нафту Brent на лонданскай біржы ICE Futures павялічыўся да $ 64,82 за барэль. Цана на нафту WTI з пастаўкай у сакавіку на электронных таргах Нью-Ёркскай таварнай біржы (NYMEX) паднялася да $ 61,21 за барэль. Саудаўская Аравія, Расія і АПЕК спрабуюць стабілізаваць сусветны рынак нафты, і вынікі іх намаганняў абнадзейваюць, заявіў міністр энергетыкі Саудаўскай Аравіі Халід аль-Фаліх.

# За непрыняцце належных антыкарупцыйных мер

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў кадравыя рашэнні аб вызваленні ад пасад міністра лясной гаспадаркі Міхаіла Амельяновіча і міністра спорту і турызму Аляксандра Шамко за непрыняцце дзейсных мер па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі правапарушэннямі ў падведамасных арганізацыях.**

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Качанава ў каментары БЕЛТА адзначыла, што патрабаванні кіраўніка дзяржавы па бескампраміснай барацьбе з карупцыяй у дзяржаўных органах і арганізацыях вядомыя. «Любы такі факт наносіць непапраўную шкоду іміджу ўлады і грамадскім адносінам у дзяржаве», — сказала яна.

«У сувязі з гэтым Прэзідэнт яшчэ раз звярнуў увагу кіраўнікоў усіх узроўняў на ўзмацненне персанальнай адказнасці па выкананні патрабаванняў антыкарупцыйнага заканадаўства, недапушчэнні правапарушэнняў у гэтай сферы. Да кіраўнікоў, у падведамасных арганізацыях якіх установяць такія факты, будуць прымацца самыя строгія, але справядлівыя меры, уключаючы вызваленне ад пасад, якія яны займаюць», — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

# Без бюракратызму і толькі па справах

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 17 лютага, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. На пытанні жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА. Тэл. 8-016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8-021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8-023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8-017 222 44 44.

## На слыху

# КАНКУРЫРАВАЦЬ НА РОЎНЫХ УМОВАХ

**На думку першага намесніка прэм'ер-міністра Васіля МАЦЮШЭЎСКАГА, у рабоце прадпрыемстваў неабходна пазбавіцца мясцовага і ведамаснага пратэкцыянізму, дырэктыўнага абмежавання канкурэнцыі. Пра гэта ён заявіў падчас калегіі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, дзе разглядаліся вынікі працы ў 2017 годзе і асноўныя задачы на 2018-ы.**

## Прывязаць манапалістаў да інфляцыі

«Беларускія прадпрыемствы неабходна навучыць канкурыраваць без выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу міністэрстваў і выканкамаў», — дадаў Васіль Мацюшэўскі. Таксама ён адзначыў, што стварэнне бар'ераў, у тым ліку і адміністрацыйных, уплывае на канчатковую цану для спажыўца і робіць дадатковы ціск на інфляцыю. Пры гэтым ён лічыць цалкам нармальным, калі на асобных стратэгічных дзяржаўных рынках адсутнічае канкурэнцыя або яна штучна абмежаваная. Але і гэтыя напрамкі патрабуюць дэталёвага вывучэння.

Не менш важнай, паводле яго слоў, сёння з'яўляецца неабходнасць ацаніць канкурэнцыю ў дзяржаўных закупках Беларусі. Васіль Мацюшэўскі адзначыў, што больш за 70 % дзяржзакупак у вартасным выражэнні ажыццяўляецца з адной крыніцы, гэта значыць не на канкурэнтнай аснове.

У сваю чаргу **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ** падкрэсліў, што ведамства вядзе работу над тым, каб распрацаваць тарыфныя і цанавыя рэгламенты па кожнай галіне. Адсутнасць сістэмы абгрунтаваных эканамічных разлікаў па ўсталяванні тарыфаў і коштаў натуральнымі манаполіямі спрыяе прыросту коштаў, які нічым не апраўданы. «Летась мы мелі рост цэн па малаку на 9,2 %, інфляцыю — 4,6 %. І ні адзін аблвыканкам не прадставіў эканамічнага абгрунтавання ўстанаўлення цэн на малако», — прывёў прыклад міністр. У МАРГ плануюць разгледзець пытанне заключэння абавязковых пагадненняў, якімі можна будзе кантраляваць цэны, што выстаўляюць манаполісты і кампаніі, якія дамінуюць на рынку. Плануецца, што ў якасці арыенціра будзе прапанаваны ўзровень інфляцыі. «Тым, хто захоча павысіць кошты вышэй за ўстаноўлены ўзровень, прыйдзецца даказваць гэтую неабходнасць», — растлумачыў Уладзімір Калтовіч.

## Толькі жывыя грошы

Падчас калегіі **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей КАЛЕЧЫЦ** адзначыў, што лішняй эмісіі грошай у краіне няма. «Грошы ніхто не друкуе. Сёння адзіны канал, праз які трапляюць беларускія рублі ў абарачэнне, — купля замежнай валюты, якая адбывалася на працягу ўсяго мінулага года. Яна не нясе ніякіх інфляцыйных рызык», — растлумачыў Сяргей Калечыц. Пры гэтым ён адзначыў, што ў Нацбанку сапраўды назіралі сезоннае павелічэнне крэдытнай актыўнасці. «Але, па сутнасці, гэта аднаўленне тых параметраў, якія зніжаліся раней. Ніякай пагрозы для прагнозных узроўняў інфляцыі мы не бачым», — рэзюмаваў намеснік старшыні.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

■ Надвор'е

# НА ВЫХАДНЫЯ ПРЫГРЭЕ ДА ПЛЮС ТРОХ ГРАДУСАЎ

## Але ў аўторак ізноў маразы да мінус 14

**Шырокі антыцыклон вызначае надвор'е ў Беларусі. Але ён павольна адыходзіць на ўсход, і ў гэтыя выхадныя атмасферныя франты прынясуць больш цёплае паветра з боку Заходняй Еўропы. Таму маразы аслабеюць, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдзе невялікі снег. Месцамі чакаюцца слабая туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 4 марозу да 2 цяпла. У суботу і нядзелю надвор'е ў Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты і больш цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з тэрыторыі Балтыйскага мора. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовы снег і мокры снег. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў, удзень будзе ад 3 марозу да 3 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і вільготная халодная паветраная маса, якая паступае з поўначы Еўропы. Ізноў пахаладае. У панядзелак у асобных раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег. Месцамі на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 5—11 марозу, удзень — ад нуля да мінус 6 градусаў. У аўторак у асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег. Месцамі на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да мінус 11 градусаў, па поўначы пры праясненнях паветра астудзіцца да 14 марозу, тэмпература удзень будзе мінус 2—8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ**

## У гонар 100-годдзя Машэрава

**У Брэсце адзначылі сотую гадавіну з дня нараджэння дзяржаўнага дзеяча Беларусі, Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы Пятра Міронавіча Машэрава.**




Фота БЕЛТА.

Пётр Машэраў працаваў першым сакратаром Брэсцкага абкама КПБ у 1955—1959 гадах. Абласны камітэт партыі тады знаходзіўся ў будынку цяперашняй адміністрацыі Ленінскага раёна. Побач з уваходам у названы будынак адбыўся невялікі мітынг памяці былога кіраўніка вобласці. У мітынгу прымалі ўдзел намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Алег Вялічка, старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай Красоўскі, старшыня гарвыканкама Аляксандр Рагачук, а таксама прадстаўнікі грамадскасці, ветэраны.

Пазней удзельнікі мітынгу накіраваліся да будынка абласнога ліцэя, дзе была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар П. Машэрава, імя якога носіць навучальная ўстанова. А ў зале пасяджэнняў адміністрацыі Ленінскага раёна прайшоў круглы стол, прысвечаны жыццю і працы вядомага дзяржаўнага дзеяча.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Уважаемые акционеры ОАО «Світанак» г. Жодино**
**27 марта 2018 года состоится годовое**
**общее собрание акционеров Открытого акционерного общества ОАО «Світанак» г. Жодино,**
**место нахождения: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1.**
**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Жодино, ул. 8 Марта, 1, актовый зал (4-й этаж)**

**Повестка дня собрания:**

1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году и основных направлениях деятельности Общества на 2018 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2017 году. Оценка деятельности директора за 2017 год. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
4. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год.
5. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2017 год.
6. О распределении прибыли предприятия и выплате дивидендов за 2017 год.
7. Утверждение плана распределения прибыли предприятия на 2018 год и периодичности выплаты дивидендов за 2018 год.
8. Внесение изменений в Устав и утверждение новой редакции Устава общества с учетом изменений и дополнений.
9. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 (библиотека профкома) с 19 по 26 марта 2018 года (время работы с 8.00 до 17.00) либо 27 марта 2018 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 14.50** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 27 марта 2018 года, 15.00.**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 марта 2018 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**

**акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение, и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 600038919

Филиал Белгосстраха по Минской области просит разместить объявление следующего содержания: Утерянные страховые полиса 2РН серии БН в количестве 2 шт. № 2334003, 2334004, «Добровольное страхование имущество граждан», в филиале Белгосстраха по Минской области считать недействительными УНП 100122726

# Свабодны рух для аўтобусаў і тралейбусаў

**Праблема грамадскага транспарту вельмі актуальная для любога мегаполіса. Вось і жыхарам Мінска часцяком прыходзіцца сутыкацца з такімі непрыемнасцямі, як заторы на дарогах і немагчымасць своечасова (асабліва раніцай ці ўвечары) даехаць да таго ці іншага месца. Але ў хуткім часе мінчане, магчыма, змогуць забыць пра цяжкасці перамяшчэння на грамадскім транспарце.**

Сёлета ў Мінску плануецца абсталяваць 80 кіламетраў палос для перамяшчэння выключна грамадскага транспарту. Па спецыяльных выдзеленых палосах аўтобусы і тралейбусы будуць перамяшчацца хутчэй за асноўны транспартны паток.

На думку **Валерыя ШКУРАТАВА, дырэктара ДУ «Сталічны транспарт і сувязь»**, гэта дазволіць не толькі павялічыць хуткасць руху аўтобусаў і тралейбусаў, перш за ўсё — у час пік, але і павысіць у цэлым прывабнасць грамадскага транспарту для гараджан.

— Удасканаленне работы пасажырскага транспарту забяспечыць рытмічнасць і надзейнасць перавозак жыхароў і гасцей горада. Цяпер рух у агульным патоку прыводзіць да парушэння хуткасных рэжымаў і, як вынік, выклікае адхіленне ў раскладзе да 40 хвілін. Напрыклад, фактычная хуткасць па будных днях у час пік на ўчастку ад прыпыначнага пункта «Чыгладзэ» да прыпыначнага пункта «Альшэўскага» складае каля 8 км/г (прыкладна на 51 % ніжэй эксплуатацыйнай хуткасці на іншых маршрутах), ад аўтавакзала «Цэнтральны» да плошчы Мяснікова — 10 км /г, — дадаў ён.

Рэалізаваць згаданы праект плануецца ў два этапы, пачынаючы з гэтага года. **Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ** ужо даў адпаведнае даручэнне.

— Калі такім чынам транспартныя арганізацыі эканомяць значныя сродкі, трэба выканаць гэту справу як мага хутчэй, — заявіў ён.

У нашай краіне ўпершыню такую практыку пачалі выкарыстоўваць у Гомелі. Але варта адзначыць, што ў Мінску таксама ўжо існуюць такія палосы для аўтобусаў і тралейбусаў на вуліцах Ташкенцкай, Маякоўскага, Старынаўскай, Куйбышава і праспектах Дзяржынскага, Пераможцаў і Незалежнасці. Іх даўжыня — 27 кіламетраў. Хуткасць руху ў сярэднім каля 18 км у гадзіну.

Абсталяваныя палосы для гарадскога транспарту будуць абазначаны дарожнымі знакамі і адпаведнай разметкай.

**Анастасія ГРУК.**

■ Здарэнне

# Уцёкі па начным горадзе

**Супрацоўнікі ДАІ затрымалі ў Магілёве 17-гадовага згоншчыка.**

На падазроныя «Жыгулі» з адной светлавой фарай інспектары ДАІ маёр міліцыі Станіслаў Рубанаў і лейтэнант міліцыі Артур Цярэшчанка звярнулі ўвагу яшчэ ў раёне гандлёвага цэнтра «Перекресток» на Пушкінскім праспекце. На патрабаванне супрацоўнікаў дарожнай інспекцыі спыніцца, кіроўца,наадварот, націснуў на газ. І пачалася пагоня. Уцякач не рэагаваў ні на гукавыя сігналы, ні на праблісквальныя маячкі. «Жыгулі» раз-пораз выязджалі на сустрэчку, пакуль не наехалі на бардзюр і не заглухлі. Кіроўца спрабаваў уцячы, але хутка яго затрымалі.

Як паведаміла **інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Таццяна СТАРАСОТНІКАВА,** за рулём машыны знаходзіўся 17-гадовы магілявянін, які не меў правоў кіроўцы, а само аўто было скрадзенае. Пра гэта сведчылі правады, якія тарчалі з-пад руля, і зламаны замок. Хутка стала вядома, што парушальнік украў машыну разам з прыяцелем і што яны абодва ў вышуку. Аматараў злачынных прыгод чакае прадугледжанае законам пакаранне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ Алімпіяда-2018

# З НАДЗЕЯЙ УЧОРА І СЁННЯ

## У чацвер беларусы выступілі ў біятлоне, лыжных гонках, горных лыжах і фрыстайле

**Надвор'е ў алімпійскім Пхёнчхане стабілізавалася, спаборніцкая праграма пайшла сваім парадкам. Яе адкрылі гарналыжнікі. Марыя Шканава выступіла ў гіганцкім слаламе, па выніках двух заездаў наша спартсменка размясцілася на 38-м радку, паказаўшы агульны час 2 хвіліны 32,33 секунды.**



*«Задаволена тым, што паспяхова завяршыла ўсю дыстанцыю, з якой сышлі амаль паўтара дзясятка спартсменак,* — сказала Марыя. — *Старалася захоўваць хуткасць і не дапускаць памылак, але не ўсё атрымалася. У душы застаўся асадак, што магла б зрабіць і больш. Алімпійская траса ў Пхёнчхане складанейшая, чым была ў Ванкуверы і Сочы».*

Юрый Данілачкін выступіў у хуткасным спуску, дзе заняў толькі 44-е месца.

У жаночай лыжнай гонцы на 10 км вольным стылем беларускія ўдзельніцы таксама аказаліся далёка за рысай прызёраў. Найлепшы вынік сярод іх у Юліі Ціханавай — 40-е месца, Паліна Сераносава размясцілася на 48-й пазіцыі, Валянціна Камінская — на 70-й. Усяго фінішавалі 90 спартсменак.

Пакуль не апраўдваюць надзеі беларускіх балельшчыкаў і айчынныя біятланісты. У перанесенай з-за парывістага ветру жаночай індывідуальнай гонцы стартавалі чатыры прадстаўніцы нашай краіны. Найлепшы вынік паказала Надзея Скардзіна, якая з адной штрафной хвілінай размясцілася на 10-м радку выніковага пратакола. Адзначым, што нават пры адсутнасці гэтага промаху Скардзіна не змагла б падняцца на алімпійскі п'едэстал.



Дар'я Домрачава лідзіравала на працягу большай часткі гонкі, але на трэцяй стральбе дапусціла прыкры промах, нават пасля яго шанцы на медаль захоўваліся, аднак на наступным агнявым рубяжы трохразовая алімпійская чэмпіёнка памылілася яшчэ тры разы, што ў выніку прынесла ёй толькі 27-е месца. *«Вядома, вельмі расчараваная другой часткай гонкі. Складана падабраць і выказаць словы, як я расчараваная апошняй стральбой. Я не адчувала, што гэта дрэнныя выстралы. На першым і другім заходзе на рубеж рабіла папраўку, можа, там нешта не так. Хачу параіцца з Альфрэдам Эдэрам адносна маёй стральбы. Я вельмі злая перад мас-стартам»,* — адзначыла спартсменка.

Ірына Крыўко стала 36-й, Дынара Алімбекава заняла 56-е месца.

Спаборніцкую праграму працягнула мужчынская індывідуальная гонка, там найлепшы вынік з беларусаў паказаў Сяргей Бачарнікаў, ён размясціўся на 18-м месцы выніковага пратакола, Уладзімір Чапелін стаў 30-м, Максім Варабей — 39-м, Раман Ялётнаў — 52-м.

На алімпійскім турніры фрыстайлістаў у чацвер стартавала жаночая кваліфікацыя сярод лыжных акрабатаў. Лідар беларускай каманды Ганна Гуськова прайшла ў фінал з першай спробы, паказаўшы выдатны скачок, які суддзі ацанілі ў 100,45 бала. Ала Цупер стартавала няўдала, зрабіўшы грубую памылку ў прызямленні, аднак выправілася ў другой спробе і адабралася ў фінальную частку спаборніцтваў, якія адбудуцца сёння (пачатак у 14.00).

Аляксандра Раманоўская ў дзвюх сваіх спробах так і не змагла паказаць, на што здольная, і, на жаль, завяршыла свой дэбютны алімпійскі турнір.

Нагадаем, што мужчыны ў лыжнай акрабатыцы ўступяць у барацьбу заўтра, спачатку ў іх пройдзе кваліфікацыйны этап, а прызёры вызначацца 18 лютага.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**



Фота БЕЛТА.

# СЯРЭБРАНАЯ ЭКАНОМІКА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вядома, у іх ёсць свая спецыфіка. «Для рынку, арыентаванага на пажылых людзей, актуальныя медыцынскія тавары, розныя прыстасаванні для дома, якія дазваляюць самастойна абслугоўваць сябе, — кажа **краінавы каардынатар Швейцарскага Чырвонага Крыжа Таццяна ГАПЛІЧНІК.** — Бо асноўная задача ў дачыненні да пажылых — дамагчыся таго, каб яны максімальна доўга маглі заставацца незалежнымі. А калі ўжо не могуць, узнікае новая задача — як максімальна захаваць годнасць».

Кітайцы, напрыклад, ужо кажуць пра тое, што да 8 % ВУП яны атрымліваюць за кошт спажыўцоў трэцяга ўзросту. І зараз дзясяткі кітайскіх кампаній перагледзяць сваю вытворчасць, арыентуючыся на пажылых спажыўцоў, адкрываюцца агенцтвы з кваліфікаванымі сядзелкамі, хатнімі прыслужніцамі і медсёстрамі, заводы выпускаюць новыя мадэлі крэслаў-качалак, гаджэты для дыстанцыйнага маніторынгу здароўя і г. д.

Але, каб старэнне насельніцтва было выгадным грамадству, каб усё больш прадпрымальнікаў і бізнесменаў далучаліся да стварэння тавараў і паслуг для людзей трэцяга ўзросту, трэба, каб з'явіўся пазітыўны імідж пажылых.

— Прыклад, які ўжо нагнаў аскому, але тым не менш яшчэ раз яго прывяду, — кажа Таццяна Гапліcнік. — Гадоў 5-6 назад у нас у офісе вісеў плакат, на якім былі намаляваныя старэчая рука і дзіцячая ручка і было напісана: «У будучыню з надзеяй, да мінулага з любоўю». Дык вось, гэта самая вялікая праблема: як гэта «пераключыць» нашы галовы і зразумець, што старасць — гэта не мінулае? Гэта цяперашняе і — будучае для ўсіх нас, хто сёння малады, таму што ўсе мы туды рухаемся. Так што гэта і ў інтарэсах маладых — ствараць свет, у якім да старасці будуць ставіцца па-іншаму і дзе будзе шмат магчымасцяў для таго, каб сябе рэалізоўваць у любым узросце.

## Паслугі для пажылых — сфера з вялікім патэнцыялам. Пакуль недаацэненым

Але ў той час, як у свеце бурна развіваецца сегмент рынку, арыентаваны на пажылых, беларускі рынак і аўдыторыя 60+ пакуль яшчэ толькі прыглядаюцца адзін да аднаго. У нас тут яшчэ поўна свабодных ніш і нават існуючыя паслугі для старэйшага пакалення ў вялікім дэфіцыце.

Мы ўжо бачым, што з'явіліся банкаўскія паслугі, арыентаваныя на пажылых, тыя ж уклады «пенсійныя». Некаторыя турфірмы, імкнучыся прыцягнуць пенсіянераў, прапануюць ім туры са зніжкай. Ёсць і страхавыя паслугі, арыентаваныя на людзей старэйшага ўзросту.

**Але ў пажылым узросце патрэбныя догляд, рэабілітацыя, бытавыя паслугі і сродкі, якія палягчаюць камунікацыю. Патрэбныя і новыя тэхналогіі. Вялікі патэнцыял існуе ў гаджэтаў для пажылых — партатыўных прылад з геалакацыяй і трывожнай кнопкай для выкліку хуткай дапамогі.**

— Служба сясцёр міласэрнасці Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа займаецца сястрынскім доглядам дома, — расказвае Таццяна Гапліcнік. — Але ў нас няма стапрацэнтнага пакрыцця ўсёй краіны, гэта пытанне фінансавання. Дзесьці нам дапамагае дзяржаўны сацзаказ, які пакуль недасканалы, але ўдасканальваецца. Больш правільна было б арганізаваць медыка-сацыяльную службу дома. І тут могуць быць як паслугі прафесіяналаў, так і мясцовай супольнасці, у прыватнасці валанцёраў (там, дзе не патрэбна прафесійная дапамога). Таму што гэта самы аптымальны шлях — старэць там, дзе ты жывеш, а не ў спецыяльна выдзеленых месцах, не ў дамах састарэлых і г. д.

Ніш сапраўды шмат. Гэта сфера з вялікім і пакуль яшчэ недаацэненым патэнцыялам, хоць яна, вядома, няпростая. І, напэўна, любы чалавек 35—40 гадоў павінен быць зацікаўлены ў тым, каб нешта ўкладваць у якасць свайго жыцця ў будучыні. У свеце для гэтага прыдумана ўжо шмат формаў. Але трэба развіць цэлы сектар, які будзе гэтым займацца.

Так, у некаторых краінах ужо рэалізуецца такая простая і разам з тым жыццядзейная ідэя, як «банкі часу», якая прадугледжвае ўзаемазалік паслуг не за грошы, а за час. Скажам, у мяне сёння ёсць час і я магу завесці суседскае дзіця ў дзіцячы сад, а суседка ў сваю чаргу потым можа выдаткаваць свой час на тое, каб прыйсці і зрабіць мне ўкол, калі яна напрыклад медсястра. Ці гэта можа адбывацца ў такой форме: вы ў якасці валанцёра займаецеся доглядам старога чалавека ў яго дома і гэтым «зарабляеце» гадзіны такога догляду сабе на будучыню або можаце перадаць іх потым свайму сваяку...

## Недастаткова сэрвісаў і арганізацый, скіраваных на трэці ўзрост

З'яўляюцца новыя ініцыятывы і ў нашай краіне. Мы ўжо пісалі пра Тэрапеўтычны парк для пенсіянераў, які ствараецца ў Мінску, пра валанцёрскі праект сумесных падарожжаў моладзі і пенсіянераў («Неба. Пенсія. Самалёт»)... І тэндэнцыя такая, што з кожным годам іх будзе ўсё больш.

Літаральна днямі малады **сацыяльны прадпрымальнік Дзмітрый КЛІМКОВІЧ** разам з некамерцыйнай установай «Цэнтр актыўнага даўгалецця» і школай патранатнага догляду «Азбука клопату» адкрыў у Мінску Цэнтр актыўнага даўгалецця.

У Дзмітрыя дзве адукацыі: ён навучаўся па спецыяльнасці «сацыяльная работа» ў БДПУ імя Танка і праваназнаўству — у МІТСО. Працуе з пажылымі людзьмі ўжо пяць гадоў: быў валанцёрам ва Універсітэце трэцяга ўзросту, выступаў каардынатарам розных праектаў. «Я зразумеў: каб арганізацыя была больш устойлівай і не залежала ад донараў і спонсараў, розных арганізацый, трэба, каб яна сама зарабляла грошы», — кажа ён. Таму Дзмітрый яшчэ раней арганізаваў і адкрыў прыватнае прадпрыемства «Каштоўны капітал», дзе працуюць людзі з інваліднасцю.

Паслугі для пажылых Дзмітрый Клімковіч лічыць вельмі перспектыўным напрамкам. «У нас з 9,5 млн насельніцтва ўжо больш за 3 млн складаюць пажылыя людзі. І недастаткова тых сэрвісаў і арганізацый, якія сёння могуць абслугоўваць іх, — кажа ён. — Яны не могуць задаволіць нарастаючы попыт. Таму мы не канкурэнты тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання, а хутчэй партнёры, бо робім агульную справу».

— У людзей старэйшага ўзросту з'яўляецца шмат вольнага часу, шмат хто гатовы плаціць за новыя веды і ўменні і за добра праведзены час. Мы можам зрабіць гэтую высnову зыходзячы з таго, якое мноства людзей прыйшло на адкрыццё нашага цэнтра, — кажа Дзмітрый. — Яны вельмі зацікаўленыя. Цэны ў нас будуць ад 3 да 5 рублёў за разавы занятак. Але мы не будзем рабіць усё платным. Будуць і нейкія бясплатныя рэчы. Мы ж не цалкам камерцыйная арганізацыя, хоць, паўтаруся, камерцыйны складнік дае нам нейкую свабоду і незалежнасць ад фінансавых донараў.

Сацыяльнае прадпрымальніцтва ў нашай краіне пакуль яшчэ толькі робіць першыя крокі. Многія блытаюць яго з дабрачыннасцю. Але сацыяльныя прадпрымальнікі дзейнічаюць на стыку дабрачыннасці і традыцыйнага бізнесу. Яны займаюцца бізнесам, накіраваным на вырашэнне найбольш вострых сацыяльных праблем: сацыялізацыі людзей з інваліднасцю, працаўладкавання неабароненых груп насельніцтва, вырашэння экалагічных праблем, рабоце пажылых і інш. Але, як адзначае Дзмітрый Клімковіч, калі не будзе належнай дзяржаўнай падтрымкі, то многае можа не атрымацца.

***

Ну а калі вярнуцца да рынку паслуг для пажылых людзей, то ёсць у нас і яшчэ адзін падводны камень, які замінае яму развівацца. Многія нашы пенсіянеры пакуль псіхалагічна не гатовыя выдаткоўваць грошы на сябе, на такія «задавальненні», як навучанне чамусьці новаму, актыўнае баўленне часу. Яны лепш дапамогуць дзецям ці ўнукам... Многія не прывыклі жыць для сябе. І ёсць яшчэ такая праслойка, якая прынцыпова не згодная ні за што падобнае плаціць. Яны лепш будуць сядзець дома, але аддаць нават тры рублі за наведванне гуртка не гатовыя. І не таму, што гэтыя тры рублі такія каштоўныя для іх бюджэту, — проста яны так не прывыклі. Гэта людзі, асноўная частка свядомага жыцця якіх прыйшлася на часы СССР, калі «ўсё было бясплатным». Але хутка пачне выходзіць на пенсію пакаленне, якое жыло і працавала ўжо пасля развалу Савецкага Саюза, многія самі займаліся прадпрымальніцтвам. Гэтая фармацыя людзей не гатовая проста сядзець дома, многія з іх працягваюць працаваць і доўга застаюцца фінансава незалежнымі. І яны будуць плаціць за паслугі, якія дазваляюць захаваць высокую якасць жыцця, — што стварае новыя магчымасці для бізнесу і эканомікі ў цэлым.

**Святлана БУСЬКО.**

## ❍ Каментарый эксперта

### Сацыяльнаму прадпрымальніцтву патрэбна падтрымка дзяржавы

**Заснавальнік і дырэктар некамерцыйнай кансалтынгавай установы «Сацыяльныя тэхналогіі бізнесу» Галіна МАЦЮШЭНКА:**

— Сёння існуе запыт грамадства на сацыяльнае прадпрымальніцтва. Таму што хоць гэта і камерцыйная дзейнасць, але яна факусіруецца на вырашэнні сацыяльных праблем. У нас пакуль мала станоўчага вопыту ў гэтым кірунку. Практычна адсутнічаюць прыклады на нацыянальным узроўні, якія маглі б натхняць актыўных людзей, схільных да сацыяльнага наватарства. Многія пачынаюць нешта рабіць, але праходзіць час, і яны «згортваюцца», таму што цяжка — патрэбна падтрымка з боку дзяржавы.

На жаль, да гэтага часу ў нас няма заканадаўства, якое стымулявала б падобныя ініцыятывы. Няма закона аб дабрачыннасці, прынятага ўжо ва ўсіх нашых суседзяў. Патрэбна інфраструктура па прасоўванні сацыяльных праектаў, навучанне сацыяльнаму прадпрымальніцтву...

Сацыяльныя прадпрыемствы часам не могуць канкураваць з іншымі, таму тут дзяржава павінна была б неяк падтрымаць іх, больш папулярызаваць, прасоўваць гэты станоўчы вопыт, бо сацыяльны бізнес дапамагае дзяржаве. Але для гэтага трэба яшчэ сфармуляваць, што такое сацыяльнае прадпрыемства і сацыяльнае прадпрымальніцтва. У нас такіх паняццяў дагэтуль няма, і тут мы чакаем пэўных крокаў ад Міністэрства працы і сацабароны.

У Расіі сацыяльнае прадпрымальніцтва ўжо атрымала вялікія маштабы і пазіцыяніруе сябе як сектар эканомікі. Там ёсць дзяржаўныя гранты, інавацыйныя фонды, якія падтрымліваюць наватараў.

У нас ужо ёсць такое пачынанне, як Social Weekend: бізнес праводзіць конкурс сацыяльных праектаў і падтрымлівае найбольш цікавыя ідэі. Дзяржава таксама магла б аб'яўляць такія конкурсы, пэўныя праграмы, якія падтрымлівалі б сацыяльных прадпрымальнікаў, альбо стымуляваць стварэнне сацыяльнага бізнесу нейкімі іншымі спосабамі: ствараць сацыяльныя стартапы і г. д. Ёсць жа ў нас конкурс «100 ідэй для Беларусі». Можна было б стварыць нешта падобнае і ў сацыяльнай сферы.

Іншыя краіны маюць вельмі пераканаўчы досвед у гэтым кірунку. Сацыяльнае прадпрымальніцтва вельмі актыўна развіваецца за мяжой, вельмі ярка ў апошні час яно выяўляе сябе ў Паўднёвай Карэі, напрыклад. Там літаральна за апошнія дзесяць гадоў з нуля створана ўся неабходная інфраструктура і выбудавана сістэма дзяржпадтрымкі. І прарыўным крокам была магчымасць некамерцыйных арганізацый займацца камерцыйнай дзейнасцю. Такія арганізацыі па змоўчанні сацыяльныя, яны ствараюцца для вырашэння пэўных праблем: жаночых, экалагічных, праблем з моладдзю, пажылымі людзьмі і г. д. І калі б яны маглі яшчэ зарабляць у сваёй дзейнасці (чаго яны сёння па заканадаўстве не могуць сабе дазволіць), тады гэты ўсплёск гаспадарчай дзейнасці, скіраванай на рашэнне сацыяльных праблем, быў бы больш прыкметным і прарыўным у Беларусі.

**Запісала Святлана БУСЬКО.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством законсервированного капитального строения, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 72/ 2**

Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 500/U-63358. Назначение: здание неустановленного назначения. Общая площадь – 11404 кв. м; фундамент – монолитный ж/бетон; стены – монолитный ж/бетонный каркас; перекрытия – ж/бетонные ребристые плиты; кровля – эксплуатируемая из бетонных плит; строительная готовность – 54 %.

**Начальная цена продажи – 1 213 056,00 бел. руб.**
**Задаток – 121 300,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000007002866, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 72, пл. 1,3612 га. Назначение – для строительства и обслуживания центра по продаже легковых автомобилей «Опель». Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. Земельный участок является неделимым. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0675 га, охранная зона сетей и сооружений канализации, пл. 0,0675 га. Запрещение. Запрет на совершение регистрационных действий на основании постановления УПИ ГУЮ Мингорисполкома от 11.12.2017 № б/н

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Центральному району г. Минска от 01.06.2015 № 1110476 АА. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов).
2. Запрещение. Запрет на основании постановления УПИ ГУЮ Мингорисполкома от 11.06.2015 № б/н.
3. Арест. Постановление ОПИ Центрального района г. Минска от 14.09.2015 № б/н.
4. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Центральному району г.Минска от 03.03.2017 № 1110656. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов).
5. Запрещение. Запрет на совершение регистрационных действий на основании постановления УПИ ГУЮ Мингорисполкома от 11.12.2017 № б/н

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, но не более чем на 20 рабочих дней.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 19.03.2018 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), проводимом 19.03.2018 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 15.03.2018 в 11.00.
Все желающие могут ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Директор ОДО «Инградо» Куницкий Марк Анатольевич, тел. +375 29 655-55-75.

**Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by**

*Кіну любою справу дзеля гумарыстычнага канцэрта. Куміры — Міхаіл Задорнаў і Фаіна Ранеўская.*

*Да розных нечаканых сітуацый стаўлюся з гумарам. Люблю пасмяяцца. Хоць пры тым асоба кансерватыўная, нават нудная. Але самакрытычная і самаіранічная.*

*З навук — гісторыя, філасофія і псіхалогія. Не прызнаю гвалту ні ў якіх праявах. Не люблю палітыку і ідэалогію — як свайго роду праявы ціску.*

*Дамаседка. Цяжкая на пад'ём, хоць раней і хацела, і любіла вандраваць. Не лідар. Не люблю публічных мерапрыемстваў і быць навідавоку. Але ў «Звяздзе» адчуваю сябе добра, тут я смелая (бо ніхто не бачыць!).*

*Займаюся краязнаўствам, тапанімікай, мовай, культурай, вераваннямі славян дахрысціянскага перыяду.*

*«Звязду» пачала выпісваць у 1989 годзе, што называецца «з прынцыпу» — каб хоць так заступіцца за родную мову. Цяпер,* — прызнаецца спадарыня Соф'я, — *без газеты не ўяўляю жыцця. Мне яна — як хор Пятніцкага. Параўнала, дарэчы, і тут жа склаўся тэкст — на матыў любімай песні «Степь да степь кругом»:*

*Ранкам будных дзён*
*Справу я знайду:*
*Снеданне зрабіць,*
*Прачытаць «Звязду».*
*Святы — не люблю:*
*Мне тады не рай:*
*Як няма «Звязды» —*
*Хоць ты памірай.*

*І гэта — не перабольшанне, бо святы я сапраўды не люблю,* — паведамляе пра сябе Соф'я Парфір'еўна. — *Яшчэ і таму, што не прыходзіць газета.*

*Першую «казку» на «Провад»,* — працягвае яна, — *адправіла ў 2002 годзе. А ўсяго напісала іх сотні са дзве (шкада, што не ўсе друкуюцца). Але ўсе яны — пра жыццё пэўнай людской супольнасці».*

Вось такія яны, нашы аўтары, нашы пераможцы.

Пра спадарыню Валянціну Паліканіну чытайце ў наступным выпуску рубрыкі.

■ Неасабісты суб'ектыў



# НЕПАЗБІРАНЫЯ КАМЯНІ

## Малая радзіма — гэта не толькі «чырвоная груша над дзедаўскім домам»

ГОД малой радзімы, які аб'явіў 2018-ы на мінулым тыдні кіраўнік краіны, напэўна, стане самым шчырым з усіх, што былі да яго. У выніку, думаю, атрымаецца шмат цікавых, вельмі добрых спраў, бо тое, што робіцца з душой, заўсёды атрымліваецца так, як задумана. Да месца, дзе нарадзіўся, дзе стаяў (а калі пашанцавала, стаіць і сёння) бацькоўскі дом, усё жыццё адчуваеш цеплыню і любоў, дзе б ты ні жыў, у якія б вялікія людзі ні выбіўся. А яшчэ, асабліва калі малая радзіма — невялікая вёска, якая ціха памірае сваёй смерцю, цвеліць душу непазбыўнае пачуццё віны, што ты яе, выправіўшыся аднойчы шукаць лепшай долі, ужо тады, калі яшчэ звінела вуліца галасамі, сядзелі бабулі на лаўках і вяртаўся надвячоркам з поля вялікі вясковы статак, пакінуў з гэтай смерцю сам-насам.

Цяпер якраз добры час, каб аб'явіць такі год. Людзі, для якіх малая радзіма не пусты гук, якія адчуваюць тыя самыя любоў, цеплыню і віну, якія маюць магчымасці, сілы і сродкі для свайго роднага кута штосьці зрабіць, сёння ў самым росквіце. (Пра такіх людзей вельмі пераканаўча напісала ва ўчарашнім нумары мая калега Святлана Яскевіч.) Гэта пакаленне, якое ў 70-х, 80-х, пачатку 90-х масава з'язджала з вёсак, пакідаючы сваю малую радзіму фактычна без будучыні, без працягу. І цяпер яны... Зрэшты, чаму «яны»? І цяпер мы, каб самім сабе і іншым давесці, што мы сваёй радзіме не здрадзілі, спрабуем зрабіць для яе хоць штосьці карыснае (пасадзіць ля хаты малады сад, напрыклад). Так што мерапрыемствы аб'яўленага года пройдуць, думаю, паспяхова. Хтосьці на малой радзіме падправіць разбураны плот каля бацькоўскай сядзібы, а хтосьці плот паставіць па ўсёй вёсцы за ўласныя сродкі.

АД гэтага ўпэўненага прадчування хораша на душы, але скрабе па ёй адно таксама ўпэўненае веданне. Калі б мы аб'явілі Год малой радзімы ў 2038-м, напрыклад, спадзявацца на людскі ўздым і натхнёнасць ужо б не давадзілася. Бо вырасла цэлае пакаленне правінцыялаў, якія да месца, дзе нарадзіліся, ставяцца калі не з пагардай, дык дакладна абыякава: у сямнаццаць гадоў абтрэслі родны пыл з ног — і дзякуй богу. І няма чаго асабліва ўспамінаць і шкадаваць. Пачуццё віны — пра што вы кажаце? Перад чым і перад кім хто вінаваты? Спытайцеся ў сённяшніх 25-гадовых, што прыехалі з перыферыі і прыжыліся ў вялікім горадзе, як часта яны бываюць у родных мясцінах, у бацькоў, якія яшчэ маладыя, жывыя і здаровыя. Адказ у большасці будзе — «Нячаста, хіба што на святы. Што там рабіць? Самота, правінцыя...»

Што атрымалася менавіта так, а не інакш, не вінаваты, бадай, ніхто. Час цяпер такі, па ўсім свеце дзеці адрываюць ад сябе карані, якія перашкаджаюць крочыць да пастаўленай мэты. Але, магчыма, Год малой радзімы — добрая нагода паразважаць аб тым, што можна зрабіць, каб у недалёкай будучыні не мець грамадства абыякавых і беспамятлівых.

Любіць, а тым больш паважаць, можна толькі тое, што добра ведаеш. Да малой радзімы гэта адносіцца нават больш, чым да іншых паняццяў. Бо малая радзіма — гэта не толькі «чырвоная груша над дзедаўскім домам». Гэта яшчэ і веданне гісторыі менавіта гэтага кавалка зямлі, яго паданняў, паходжання яго назваў, смешных і павучальных выпадкаў з удзелам тваіх землякоў, лёсаў гэтых людзей. З такога ведання нараджаецца гонар — яшчэ адзін надзвычай важны складнік любові да роднай зямлі. Але ж гэта веданне менавіта пра сваю радзіму (калі гэта не вялікі горад з багатым мінулым) не знойдзеш ні ў падручніку гісторыі, ні нават ва ўсюдыіснай «Вікіпедыі».

Тры гады назад у рэдакцыі «Звязды» мы праводзілі круглы стол, падчас якога гаварылі аб значнасці развіцця практычнага краязнаўства непасрэдна на месцах, аб тым, што яно можа стаць стрыжнем патрыятызму ў нашай маладой дзяржаве. Удзельнікі дыскусіі казалі пра тое, як важна далучаць да гэтай работы вучняў, ладзіць невялікія, лакальнага маштабу даследчыя экспедыцыі, размаўляць са старымі людзьмі, якія былі сведкамі значных для гэтай мясцовасці падзей. Выказвалася вялікая занепакоенасць лёсам музеяў вясковых школ. «Бо ні ў адной іншай краіне на прасторах былога Саюза няма такой колькасці музеяў, дзе захоўваюцца ўнікальныя дакументальныя матэрыялы. У іх працуюць проста апантаныя сваёй справай людзі. Многія з гэтых музеяў знаходзяцца на базе школ, у тым ліку вясковых. Цяпер школы ўзбуйняюцца, аб'ядноўваюцца з іншымі, і гэтыя музеі знаходзяцца пад пагрозай знікнення разам з матэрыяламі. І гэта праблема патрабуе вырашэння, інакш мы можам беззваротна страціць вялізны пласт нашай гісторыі», — эмацыянальна гаварыў тады адзін з самых, бадай, нераўнадушных да тэмы краязнаўства людзей доктар гістарычных навук Аляксандр Каваленя.

Добрая падказка для тых, хто мае магчымасці і сродкі зрабіць штосьці значнае для сваёй малой радзімы, але не ведае, што менавіта. Пазбірайце раскіданыя камяні, якія могуць стаць добрым падмуркам для наступных пакаленняў. Басейны, тэнісныя корты, новыя храмы — усё гэта, канешне, вельмі добра, проста выдатна. Але калі мы не паклапоцімся пра дасведчанасць адносна гісторыі родных мясцін, пра павагу да яе тых, хто, прыцягнуты ўсімі дабротамі цывілізацыі, застанецца жыць у правінцыі, пра адраджэнне гэтых самых мясцін можна будзе гаварыць вельмі нават умоўна.

БО галоўны — духоўны — складнік адраджэння ніхто не адмяняў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Весела!

# А фізрук стаў... Ваенгай!



**«Адзін у адзін» па-лёзненску — гэта праект, дзякуючы якому людзі, вельмі далёкія ад мастацтва, становяцца «зоркамі» пародыі**

**ПЕРШЫЯ выпрабаванні правялі пазалетась, і з кожным годам праект становіцца ўсё больш цікавым. На прадстаўленне не сорамна запрасіць нават вядомых артыстаў, каб яны ўбачылі сваіх двайнікоў. Зусім, як можа паказацца скептыкам, не местачковы праект, а цікавае шоу адбылося днямі. Там пабываў і наш карэспандэнт.**





Усе білеты коштам 4 рублі на прадстаўленне ў раённы Дом культуры былі прададзеныя за пару дзён, што пацвярджае папулярнасць шоу ў раёне. Канчыта Вурст, Маргарыта Церахава, Алена Ваенга, Людміла Гурчанка — гэтых і многіх іншых зорак можна было ўбачыць на сцэне. Самадзейныя артысты працуюць у розных арганізацыях, на прадпрыемствах. Раней большасць з іх ніколі не выходзіла на сцэну, але яны вельмі пастараліся ўвайсці ў вобразы. Ды так, што многіх нават тутэйшыя не адразу пазнавалі.

Напрыклад, настаўнік фізкультуры стаў... Аленай Ваенгай. А грузчык хлебнай базы з жонкай цудоўна прадставілі вобразы гатаў з серыяла «Сваты». Пара, дарэчы, атрымала найвышэйшы бал — «пяцёрку».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Лёзненскі раён*

■

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.27 | 18.20 | 9.53 |
| Віцебск — | 8.20 | 18.07 | 9.47 |
| Магілёў — | 8.17 | 18.10 | 9.53 |
| Гомель — | 8.10 | 18.11 | 10.01 |
| Гродна — | 8.42 | 18.36 | 9.54 |
| Брэст — | 8.49 | 18.40 | 9.51 |

## Месяц

***Маладзік у 0.05.***
***Месяц у сузор'і Рыб.***

## Імяніны

***Пр.*** *Ганны, Івана, Мікалая, Рамана, Сямёна, Уладзіміра, Уласа, Цімафея.*
***К.*** *Дануты, Даніэля, Юльяна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА





## Даты | Падзеі | Людзі

**16 ЛЮТАГА**





**1758** год — нарадзіўся (в. Скокі, цяпер у Брэсцкім раёне) Юльян Нямцэвіч, пісьменнік, гісторык, палітычны дзеяч. Падчас паўстання 1794 года — ад'ютант і сакратар Т. Касцюшкі. Быў паранены, зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць у Санкт-Пецярбургу. У 1796-м разам з Касцюшкам выехаў у ЗША, дзе пражыў дзесяць гадоў. Вярнуўшыся на радзіму, распачаў некалькі падарожжаў па Беларусі з мэтай апісання гістарычных помнікаў. Адзін з найбольш выдатных пісьменнікаў свайго часу, аўтар драматычных і паэтычных твораў, раманаў, аповесцяў, дарожных нататак. Апісанні Брэста, Гродна, Слоніма, Навагрудка, жыцця беларускіх сялян утрымліваюцца ў яго кнізе «Гістарычныя падарожжы...» Памёр у 1841 годзе.



**1925** год — нарадзіўся (г. Васілевічы Рэчыцкага раёна) Іван Навуменка, беларускі пісьменнік і літаратуразнавец, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, народны пісьменнік Беларусі. У 1973—1982 гадах дырэктар Інстытута літаратуры АН Беларусі, у 1982—1992-м — віцэ-прэзідэнт АН Беларусі, з 2002-га — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры НАН Беларусі. Апублікаваў больш за 200 навуковых прац, больш за 80 выдадзеных асобнымі кнігамі мастацкіх твораў. Аўтар раманаў «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Асеннія мелодыі», «Сорак трэці» і інш. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі. У 2000 годзе ўзнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені. Памёр у 2006 годзе.





**1568** год — Іспанская інквізіцыя вынесла смяротны прысуд усім жыхарам Нідэрландаў. Яшчэ ў 1523 годзе ў Антверпене на вогнішчы спалілі двух першых пратэстанцкіх пакутнікаў. Для барацьбы з пратэстантамі прымаліся самыя суровыя меры. А некаторыя з рашэнняў інквізіцыі — такія як смяротны прысуд усім жыхарам Нідэрландаў (вядома ж, не прыведзены ў выкананне) — засталіся як своеасаблівыя кур'ёзы гісторыі. Увядзенне інквізіцыі ў Іспанскіх Нідэрландах стала адной з прычын Нідэрландскай рэвалюцыі 1566—1609 гадоў, у выніку чаго Нідэрланды распаліся на дзяржаву пратэстантаў і дзяржаву католікаў.

**1893** год — нарадзіўся (маёнтак Аляксандраўскае Дарагабужскага павета Смаленскай губерні) Міхаіл Тухачэўскі, вядомы савецкі военачальнік, маршал Савецкага Саюза. Ён адыграў немалую ролю ў змене арганізацыйнай структуры Чырвонай Арміі, яе падрыхтоўцы і тэхнічным пераўзбраенні, у стварэнні новых родаў войск — авіяцыі, механізаваных часцей, ВМС, паветрана-дэсантных войскаў. Ён быў ініцыятарам стварэння шэрагу самастойных ваенных акадэмій, напрыклад механізацыі і матарызацыі і інш. Тухачэўскі — аўтар шматлікіх кніг, артыкулаў і дакладаў, якія змяшчаюць сістэму стратэгічных поглядаў на сучасную вайну, дзе ён, у прыватнасці, падкрэсліваў неабходнасць падрыхтоўкі арміі да доўгай зацяжной вайны, што ішло ўразрэз з тагачаснай савецкай ваеннай дактрынай. Працы Тухачэўскага аказалі значны ўплыў на развіццё савецкай ваеннай навукі і практыку ваеннага будаўніцтва. Рэпрэсаваны ў чэрвені 1937 года.

## УСМІХНЕМСЯ

**Зараз бачыў жанчыну-кошку.**
**Яна доўга стукалася ў дзверы аўтобуса, а калі кіроўца ёй адкрыў, не стала ўваходзіць.**

— Тата, а як звалі цешчу Адама?
— У яго не было цешчы, сынок. Ён жыў у раі.

**Учора вывучаў радавод майго сабакі за 300 гадоў.**
**Добра, што ён не ўмее чытаць, а то мне прыйшлося б раніцай яму газету, каву і тапкі прыносіць.**

Жонка пайшла на аўтамабільныя курсы. Першы занятак па ваджэнні. Прыходзіць з яго і заяўляе:
— Гараж купляць не буду, я ў яго заехаць не змагла!

**Работніца аўтазапраўкі збірала сына ў паход з разліку 7 бутэрбродаў на 100 кіламетраў.**

Фразы, якія небяспечна прамаўляць:
«Ты памыляешся» — на адрас жонкі.
«Я не хачу есці» — на адрас бабулі.
«Зрабіце на свой густ» — на адрас цырульніцы.





caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 701.
Нумар падпісаны ў 19.30 15 лютага 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
16 лютага 2018 г. № 7 (440)



стар. 3

Падстаў для засмучэння пакуль няма



стар. 15

Што можа дэпутат?



стар. 16

Паспрабуйце пачаць... з нуля

ДАТЭРМІНОВА!

# ВЯЛІКІЯ МЭТЫ ПАЧЫНАЮЦЦА З МАЛЫХ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**БЕЛАРУСКІ нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт па праве лічыцца адным з найлепшых у краіне. Адначасова тут атрымліваюць веды больш за 35 тысяч чалавек. Многія са студэнтаў — іншагароднія, таму замацаваны за ўчасткамі, да якіх тэрытарыяльна адносяцца інтэрнаты. Усяго ў БНТУ арганізавана тры ўчасткі для галасавання.**
**Мы пабывалі на адным з іх, размешчаным у корпусе аўтатрактарнага факультэта, і паназіралі за ходам датэрміновага галасавання.**

Галоўная прычына, чаму студэнты лічаць за лепшае галасаваць загадзя, вельмі простая: большасць з іх прывыклі ездзіць дамоў да бацькоў практычна кожныя выхадныя. Ды і наогул — прымусіць сябе лішні раз наведаць храм ведаў у законны выхадны могуць далёка не ўсе. Так што аўдыторыю, прызначаную для галасавання, нават у першай палове дня нельга назваць пустуючай.

стар. 13

З ВЕДАННЕМ СПРАВЫ

## Аляксандр ПАПКОЎ:

# АДЫСЦІ АД АБЫЯКАВАСЦІ І ПАДЫСЦІ ДА ПРАБЛЕМЫ ТВОРЧА



**Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў даў інтэрв'ю газеце «Мясцовае самакіраванне».**

***— Аляксандр Андрэевіч, выбарчая кампанія завяршаецца, 18 лютага адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Вы як старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні заўсёды знаходзіцеся ў эпіцэнтры актуальных праблем насельніцтва ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Што чакаеце ад новага складу дэпутацкага корпуса?***

— Кампетэнцыя і паўнамоцтвы Саветаў дэпутатаў дакладна вызначаныя Канстытуцыяй нашай краіны і Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», а артыкул 121 Канстытуцыі вызначае выключную кампетэнцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў, у тым ліку ў частцы зацвярджэння праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця, мясцовых бюджэтаў і справаздач аб іх выкананні, устанаўлення ў адпаведнасці з законам мясцовых падаткаў і збораў, вызначэння парадку кіравання і распараджэння камунальнай уласнасцю.

> Калі ў поўнай меры выкарыстоўваць дадзеныя заканадаўствам магчымасці, то мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць усе паўнамоцтвы для актыўнай работы па сацыяльна-эканамічным развіцці свайго пасёлка або раёна.

Ад новага складу дэпутацкага корпуса выбаршчыкі чакаюць канкрэтнай работы.

На жаль, аналіз грамадскай думкі паказвае, што дэпутатам мясцовага ўзроўню часта не хапае ініцыятывы. Відавочна, што наспела неабходнасць стварэння дакладнай сістэмы ўзаемадзеяння выканаўчай улады з дэпутатамі, якая будзе накіравана на развіццё эканомікі канкрэтнага рэгіёна. Ад гэтага залежыць і вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва. Дэпутаты ўсіх узроўняў разам з органамі ўлады і жыхарамі сваёй выбарчай акругі павінны зрабіць усё, каб у кожным населеным пункце (незалежна ад таго, Мінск гэта ці невялікая вёска) былі створаны належныя ўмовы жыцця, каб кожны чалавек адчуваў сябе абароненым, упэўненым у заўтрашнім дні.

стар. 4, 13

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# ПРАБЛЕМА — У АДСУТНАСЦІ РАШЭННЯЎ

*Міхаіл Мясніковіч пра саюзныя праграмы і развіццё інтэграцыі*

**Адбылося пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента Міхаіла МЯСНІКОВІЧА. Адной з галоўных тэм яго стала справаздача Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах аб дзейнасці ў мінулым годзе і задачах на 2018-ы. Пра вынікі і планы паведаміў старшыня камісіі Уладзімір Панцюхоў.**



Падводзячы вынікі мерапрыемства, Міхаіл Мясніковіч звярнуў увагу на важнасць захавання ў заканатворчай дзейнасці пакетнага прынцыпу, правядзення навуковай экспертызы, прагназавання наступстваў прыняцця нарматыўных прававых актаў. Асобна ён падкрэсліў ролю праграм Саюзнай дзяржавы ў інтэграцыйных працэсах: «Гэта сувязнае для нас звяно — саюзныя праграмы, агульныя праекты, прадпрыемствы і вытворчасці».

У той жа час не заўсёды саюзныя праграмы распрацоўваюцца і рэалізуюцца эфектыўна. «На распрацоўку і прыняцце праграм ідуць гады. Ідзі з цягам часу старэюць, — канстатаваў ён. — Бо самая вялікая праблема — гэта адсутнасць прававых актаў. Лепш паправіць, чым гадамі не прымаць». У сувязі з гэтым неабходна ўдасканаліць механізм адбору, узгаднення і прыняцця саюзных праграм. «За імі не толькі эканамічная выгада, але і наша інтэграцыя», — рэзюмаваў Міхаіл Мясніковіч.

# СОНЦА І ДЛЯ БЕЛАРУСІ ЎЗЫХОДЗІЦЬ

*Сенатар Сяргей Рахманаў наведаў Японію*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы правёў серыю сустрэч з прадстаўнікамі парламента Японіі, а таксама дзелавымі коламі гэтай краіны.**

У прыватнасці, адбылася сустрэча з парламенцкай групай дружбы Японіі і Беларусі на чале са старшынёй камісіі парламента Японіі па рэгіянальным развіцці Хірамішы Ватанабэ. У час перагавораў абмеркаваны пытанні двухбаковага супрацоўніцтва і міжпарламенцкага ўзаемадзеяння Беларусі і Японіі.

Таксама Сяргей Рахманаў сустрэўся з намеснікам кіраўніка Генеральнага савета па грамадскай бяспецы кіруючай ліберальна-дэмакратычнай партыі Японіі, былым дзяржаўным міністрам па сацыяльных пытаннях Масака Моры. Падчас сустрэчы разгледжаны магчымасці прымянення тэхналогій беларускай кампаніі «Гейм Стрым» для рэабілітацыі тэрыторый, што пацярпелі ад аварыі на АЭС «Фукусіма-1».

Акрамя таго, Сяргей Рахманаў правёў сустрэчу з прэзідэнтам японскай федэрацыі біятлона. Разгледжаны пытанні супрацоўніцтва ў галіне спорту, у тым ліку на ўзроўні алімпійскіх камітэтаў.

# НЕ ПАПЯРОВЫ, А ДЗЕЙСНЫ САЮЗ

*У Саюзе Беларусі і Расіі абмеркавалі правы грамадзян*

**Пытанні гарманізацыі заканадаўства па забеспячэнні роўных правоў грамадзян Беларусі і Расіі абмеркаваны ў ходзе пасяджэння Камісіі Парламенцкага сходу па заканадаўстве і рэгламенце, якое прайшло ў Гомелі.**

«У выглядзе рэкамендацый падрыхтаваны выніковы дакумент, дзе пазначаныя прыярытэтныя кірункі развіцця Саюзнай дзяржавы на 2018—2020 гады. У ліку першачарговых мер варта адзначыць пытанні гарманізацыі і ўніфікацыі заканадаўства ў галіне забеспячэння роўных правоў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання Беларусі і Расіі», — паведаміла намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу, **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала БОДАК.**

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

ПЫТАННЕ З НАГОДЫ

# ХТО ЁН — АБРАННІК НАРОДА?

**18 лютага адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мы пацікавіліся ў нашых чытачоў, якімі якасцямі, на іх думку, павінен валодаць дэпутат мясцовых Саветаў і якія праблемы яму неабходна вырашаць?**

**Генадзь МАГІЛЬНІЦКІ, кіроўца Гарадоцкага раённага Дома культуры:**

— Упэўнены, што дэпутатам можа быць чалавек з добрай рэпутацыяй, шчыры і блізкі да народа, гатовы, нягледзячы на занятасць, народныя інтарэсы абараняць. Пасля перамогі на выбарах дэпутат абавязаны арганізоўваць сходы з выбаршчыкамі, наведваць іх па месцы жыхарства.

Якія пытанні патрабуюць першачарговага вырашэння? Ну вось, напрыклад, жывём у краіне, багатай на лясы, а з дровамі часам проста бяда. Яны мне патрэбны, каб цёпла было на дачы ў вёсцы Насачы, дзе часта бываю. У лясніцтве, напрыклад, заказаць дровы — праблема. Ды і чарга, каб іх купіць... А самім нарыхтоўваць нельга, як калісьці. Звяртаўся ў сельвыканкам, але, напэўна, пытанне трэба вырашаць на больш высокім узроўні.

А яшчэ хацелася б, каб улады лепш клапаціліся пра падсыпку ў снежную пару года дарог да вёсак, дзе жыхароў можна на пальцах пералічыць... Ды і асартымент крам на колах нядрэнна было б пашырыць, каб людзі ў вёсках не адчувалі сябе «закінутымі».

**Марыя ЛЕШКА, жыхарка вёскі Аксакаўшчына Мінскага раёна:**

— На маю думку, дэпутат павінен валодаць такой рысай характару, як настойлівасць, або, як кажуць у народзе, настырнасць. Не баяцца адстойваць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў у кабінетах чыноўнікаў самага высокага ўзроўню. Па прынцыпе: стукайце — і вам адчыняць.

Сёлета мы ўсім домам пойдзем галасаваць за нашу Марыю Іванаўну, баявую, нераўнадушную жанчыну, якая жыве ў маім пад'ездзе і заўсёды зробіць тое, што задумала. Менавіта яна шмат зрабіла для жыхароў населенага пункта, хоць і не была дэпутатам. Дзякуючы ёй уладкавалі, агарадзілі дзіцячую футбольную пляцоўку, паклалі асфальт у дварах. Вядома, давялося нялёгка, але яна ездзіла, цярабіла, так бы мовіць, начальства, пакуль не дасягнула станоўчага выніку. Неяк сустракаю сваю суседку, кажу: «Марыя Іванаўна, не лішне было б дах перакрыць — дом жа стары, будаваўся недзе ў 70-х гадах мінулага стагоддзя». «Добра, буду дабівацца, каб пытанне вырашылі. А заадно і ўцяплілі вуглавыя кватэры», — адказвае. І людзі ўпэўнены: яна гэта зробіць, бо неаднаразова ва канкрэтнымі справамі даказвала, што слоў на вецер не кідае.

**Ігар КАВАЛЁЎ, дырэктар Слаўгарадскай сярэдняй школы № 1:**

— Дэпутат павінен быць адказны, працавіты, сумленны, прыстойны і кваліфікаваны. Павінен ведаць, што ён робіць і навошта. Ад дэпутата мясцовага Савета перш за ўсё патрабуецца, каб ён актыўна займаўся праблемамі сваіх выбаршчыкаў, быў кампетэнтны ва ўсіх пытаннях, лабіраваў інтарэсы грамадзян перад нейкімі службамі. Мне асабіста да дэпутатаў ніколі не прыходзілася звяртацца, бо ведаю сам, як і дзе можна вырашыць свае пытанні. Але, пры неабходнасці звязацца з дэпутатам не праблема. У нас, напрыклад, у школе штомесячна праводзяцца Дні інфармавання, на якіх прысутнічаюць у тым ліку і дэпутаты, праўда, у якасці прадстаўнікоў тых ці іншых службаў. Але не забараняе звярнуцца да іх як да дэпутатаў. Народны абраннік павінен заўсёды помніць пра сваю місію, не дапускаць амаральных учынкаў. Гэта недаравальна для любога чалавека, а пры такой пасадзе тым больш. Народны абраннік павінен быць прыкладам для іншых.

**Дар'я ШАРАМЕТ, харэограф, г. Мінск:**

— На дэпутата ўскладзена шмат функцый — часта не ўсе пытанні могуць «дабрацца» да яго. Таму важнымі якасцямі можна лічыць мабільнасць і арганізаванасць. Значэнне таксама мае адданасць выбранай дзейнасці. Калі дэпутат усё выконвае з душой, з разуменнем уласнай справы і адказнасцю, то павышаецца і ўзровень даверу насельніцтва да чыноўнікаў, і якасць жыцця.

Што да праблем, якія можна «адрасаваць» дэпутату, то для мяне адна з галоўных — гэта паркавачныя месцы. Добра жывём, калі машыны няма куды ставіць! Хвалюе і ўладкаванне лесапаркавай зоны. Побач з маім домам ёсць лес, дзе маладыя матулі гуляюць з немаўлятамі, гаспадары выгульваюць сабак, аматары спорту бегаюць. Добра, калі б для камфорту жыхароў там з'явіліся ліхтары, лаўкі ды сметніцы.

**(Працяг тэмы на стар. 3, 13)**

ШТО КАЖУЦЬ...

# ПРАДСТАЎНІКІ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПРА ВЫБАРЫ

**Канцэрты, мабільныя праграмы і тысячы акрэдытаваных назіральнікаў. Мы запыталі ў прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў, якім чынам яны бяруць удзел у выбарчай кампаніі?**

**Эліна БРАГА, другі сакратар ЦК ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»:**

— На першай выбарчай кампаніі Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі паставіў перад сабой некалькі задач. Па-першае, стартавалі мерапрыемствы па павышэнні электаральнай актыўнасці маладых людзей. Па ўсёй краіне ідзе акцыя «Моладзь вырашае!». У пунктах пікетаў стаяць скрыні, дзе выбаршчыкі могуць пакінуць свае наказы, прапановы будучаму дэпутату пэўнай акругі. Нашы сябры акумулююць гэтыя звароты. Пасля пажаданні выбаршчыкаў будуць перададзены новым дэпутатам. Таксама мы распаўсюджваем улёткі, публікуем інфармацыю пра выбары, вытрымкі з Выбарчага кодэкса. БДУІР і Мінская гарадская арганізацыя БРСМ распрацавалі для сталіцы мабільную праграму «Галасую!». З яе дапамогай можна атрымаць інфармацыю аб кандыдатах, даведацца, дзе размешчаны пэўны ўчастак для галасавання. Магу сказаць, што наша моладзь актыўна ўключана ў выбарчую кампанію. БРСМ прыкладае намаганні, каб малады чалавек прыйшоў на ўчастак і зрабіў свой асэнсаваны выбар.

Яшчэ адна наша задача, каб моладзь праявіла сябе ў якасці членаў участковых камісій і назіральнікаў. Сёння БРСМ займае адно з вядучых месцаў сярод грамадскіх аб'яднанняў па актыўнасці маніторынгу выбараў. Таксама мы займаемся і навучаннем будучых назіральнікаў. Каб якасна працаваць, яны павінны ведаць Выбарчы кодэкс і свае абавязкі.

Акрамя таго, у выбарчай кампаніі задзейнічаны валанцёрскі рух. Добраахвотнікі дапамогуць і ў час датэрміновага галасавання, і ў дзень выбараў маламабільным грамадзянам, людзям пажылога ўзросту, маладым мамам з калясками. Гэта вельмі важная місія. Усе беларусы павінны мець магчымасць зрабіць свой выбар.

**Аляксандр ШАЦЬКО, намеснік старшыні Рэспубліканскага савета РГА «Белая Русь»:**

— Я лічу, што выбарчая кампанія праходзіць вельмі плённа. Актыўныя сілы — гэта прафесійныя саюзы, «Белая Русь», БРСМ і іншыя грамадскія аб'яднанні. Старанна праводзіцца работа з сацыяльнымі сеткамі, рознымі сайтамі. Радуе і якасць агітацыйных матэрыялаў. Наладжаная работа ідзе на пунктах пікетаў. Спрыяюць засяроджванню ўвагі выбаршчыкаў і канцэртныя праграмы. Сапраўдны фестываль пікетаў адбыўся каля Камароўскага рынку. Ён быў ініцыяваны ў тым ліку і нашай арганізацыяй.

У выбарчай кампаніі ўдзельнічаюць вельмі дастойныя кандыдаты. Дарэчы, тэндэнцыяй гэтага года стала тое, што мы актывізавалі стасункі кандыдатаў з грамадскімі аб'яднаннямі. Калі раней многія ішлі на выбары як самавылучэнцы, то цяпер яны прадстаўляюць пэўнае аб'яднанне. Напрыклад, сярод кандыдатаў у мясцовыя Саветы дэпутатаў больш за 9000 членаў арганізацыі «Белая Русь».

**Максім МІСЬКО, старшыня праўлення ГА «Беларускі фонд міру»:**

— На сёння каля трох тысяч членаў Беларускага фонду міру ўключаны ў выбарчыя камісіі рознага ўзроўню — участковыя, акруговыя, тэрытарыяльныя. Прыкладна 1400 чалавек зарэгістраваны назіральнікамі. Лічу, што гэта паказчык актыўнага ўдзелу грамадскага аб'яднання ў выбарчай кампаніі. Акрамя таго, больш за 70 чалавек, членаў нашай арганізацыі, з'яўляюцца кандыдатамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў па ўсёй краіне. У Мінску ад Фонду міру прадстаўлены тры кандыдаты. Яны балатуюцца ў Заводскім, Цэнтральным і Фрунзенскім раёнах. Мы на ўсіх узроўнях удзельнічаем у выбарчай кампаніі. Увогуле, выбары — гэта важны працэс дэмакратычнага грамадства, які з'яўляецца неад'емнай часткай яго жыцця.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Лідзія ЯРМОШЫНА:

# «ПАДСТАЎ ДЛЯ ЗАСМУЧЭННЯ ПАКУЛЬ НЯМА»

**У інтэрв'ю тэлеканалу АНТ намеснік старшыні Парламенцкай асамблеі АБСЕ, спецпрадстаўнік па Усходняй Еўропе Кент Харстэд сказаў, што многія пажаданні яго арганізацыі падчас выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў не былі ўлічаны. Наш карэспандэнт пагутарыў са старшынёй Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіяй ЯРМОШЫНАЙ і высветліў, як будзе мяняцца выбарчая сістэма, чым нашы дэпутаты адрозніваюцца ад калег з Расіі, а таксама хто можа стаць яе пераемнікам.**



Фота БЕЛТА.

**— Якія рэкамендацыі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ могуць стаць штуршком для змен у выбарчым заканадаўстве? Наколькі яны неабходныя?**

— Выбарчае заканадаўства ўдасканальваецца пастаянна, проста яно павінна быць зыхлым і зразумелым. Я заўсёды выходжу з таго, што выбарчы закон выконваюць не прафесійныя юрысты, а звычайныя грамадзяне. Яны павінны адчуваць сябе ў гэтым працэсе лёгка, яны не павінны запамінаць і зазубрываць нормы. Тут трэба кіравацца чалавечай логікай і здаровым сэнсам.

Таму мы, вядома, будзем удасканальваць заканадаўства, але пры гэтым па-ранейшаму рабіць усё, каб яно было простым. У адрозненне ад многіх іншых дзяржаў, у тым ліку СНД, у нас няма нейкіх вызваленых арганізатараў выбараў, няма нейкіх вызваленых тэрытарыяльных камісій, якія павінны працаваць і паказваць насельніцтву, чым яны займаюцца. У нас жа робяць усё грамадскія дзеячы, а самі выбары ў краіне арганізоўваюць толькі дзевяць чалавек — гэта Цэнтральная выбарчая камісія.

Я не магу сказаць, што мы рэвалюцыйна зменім заканадаўства, — яно можа змяніцца радыкальна толькі пры зменах у Канстытуцыі. Калі нешта змяняць у гэтым дакуменце, то з улікам яго нормаў будзе мяняцца і выбарчы працэс. І тут не трэба цалкам абапірацца на пазіцыю АБСЕ. У нас дастаткова ўласных кваліфікаваных юрыстаў, ёсць парламент, які мае права сам вызначаць, што добра, а што дрэнна для Беларусі.

Кожныя выбары павінны забяспечваць стабільнасць і зразумеласць. Мне расказваў мой кіеўскі калега, як у адной выбарчай акрузе, умоўна кажучы, у Днепрапятроўску, у выбарах удзельнічала 63 кандыдаты. Скажыце, гэта нармальна? Выбарчы бюлетэнь не можа быць даўжэйшы за адзін метр, усе даныя аб удзельніках напісаны дробным-дробным шрыфтам. Усё гэта вельмі дэмакратычна, але ці з'яўляецца ў такім выпадку выбар выбаршчыка ўсвядомленым?

Мы будзем карыстацца тымі рэкамендацыямі АБСЕ, якія спрашчаюць працэдуру выбараў перш за ўсё для кандыдатаў. Прынамсі, на гэта буду працаваць я. Каб было прасцей вылучыцца, каб не было пакаранняў за дробныя памылкі ў дэкларацыях, каб паменшылася колькасць подпісаў для вылучэння.

**— Ці былі на вашай памяці выбары, пасля якіх вы зразумелі, што выбарчая сістэма мае патрэбу ў зменах?**

— Сістэма — не, а нормы — так. Я магу сказаць, што пасля парламенцкіх выбараў 2012 года я сама звярнулася перш за ўсё да кіраўніка дзяржавы з прапанадамі па змяненні выбарчага заканадаўства. Чаму? Таму што ў нас вельмі шырокія нормы ў законе, яны ўсе скіраваны на добраахвотнае выкананне, таму нядобрасумленныя людзі заўсёды могуць знайсці пэўныя шчыліны.

Менавіта таму Цэнтральная камісія звярнулася з прапановамі, і ўжо да 2013 года былі ўнесены змены ў закон, якія закранулі, напрыклад, парадак інфармавання насельніцтва. У нас жа як было: на выраб ліставак кандыдатам выдавалася невялікія сумы. У выніку атрымлівалася так, што ні кандыдаты, ні камісіі гэтага не рабілі. Потым мне сталі пісаць грамадзяне з цалкам абгрунтаванымі прэтэнзіямі: яны панікуюць не маюць, хто ў нас балатуецца.

Усе кажуць: хадзіце на сустрэчы з выбаршчыкамі. Але ж не ходзяць! Такім чынам, хоць інфармацыйныя матэрыялы павінны быць. Тады мы забралі грошы ў кандыдатаў — гэта была мая прапанова — і перадалі ў выбарчыя камісіі. І зараз ёсць абавязковае патрабаванне, каб камісіі вырабілі інфармацыйныя матэрыялы і ўклалі ў паштовыя скрыні. Прынамсі, цяпер да паходу на ўчастак грамадзянін бачыць, хто балатуецца па яго акрузе...

Не хочацца усё цалкам зарэгуляваць, паколькі гэта будуць вельмі тоўстыя законы, якія немагчыма будзе вывучыць. З іншага боку, свабодныя нормы дазваляюць рабіць любыя манеўры. Усе яны законныя, калі няма забароны, але яны не павінны супярэчыць духу заканадаўства.

Так што нормы змяняюцца ўвесь час. Мяняць выбарчую сістэму? Любая сістэма досыць добрая, але я ў пэўным плане лічу, што нам трэба глядзець у бок партый. Яны ў нас не развіваюцца, і гэта ненармальна. Як бы мы ні казалі пра прадстаўнікоў насельніцтва, усюды ў свеце прыналежнасць да партый дазваляе фарміраваць нейкае палітычнае асяроддзе. Так што, напэўна, у будучыні нам трэба адаптаваць выбарчую сістэму пад патрэбы партый. Гэта значыць перайсці да прапарцыйнай або змешанай сістэмы, даваць магчымасць партыям мець нейкія квоты, калі яны збяруць неабходную колькасць галасоў.

**— У параўнанні з некаторымі прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса Расіі беларускіх дэпутатаў можна назваць узорам спакою. Чаму ў Беларусі і Расіі яны так адрозніваюцца, ці патрэбныя нашай краіне яркія дэпутаты?**

— Я абсалютна за яркіх і медыйных дэпутатаў. Я лічу, што ў нас іх мала на экране, таму нішу даводзіцца запаўняць мне, што таксама няправільна. За мяне ніхто не галасуе, таму мне ўсё роўна, я магу знаходзіцца ў цішы кабінета.

З іншага боку, у нас жа іншая выбарчая сістэма — па-першае, яна мажарытарная. У Расіі яна змешаная: ёсць партыі, якія падбіраюць яркіх, эпатажных персон, каб адну партыю адрозніваў ад іншай. Я думаю, што, калі мы пяройдзем да падобнай сістэмы — змешанай або прапарцыйнай, — у нас такія фігуры з'явяцца самі сабой. Яны ёсць і цяпер, проста іх не відаць на тэлеэкране. Што да самога парламента, у нас туды праходзяць прадстаўнікі наменклатуры. Гэта салідныя людзі, якіх немагчыма ўявіць публічнымі клоўнамі.

Я думаю, што неадназначныя паводзіны — гэта добра толькі для таго, каб пра дадзены орган казалі. Гаварыць пра тое, што такі дэпутат лепшы і разумнейшы, мы не можам, гэта толькі спосаб паводзін.

**— Вы расказвалі, што ЦВК можа накіраваць сваіх назіральнікаў на выбары прэзідэнта Расіі. Якія аспекты расійскай кампаніі можна пераняць нам напярэдадні выбараў Прэзідэнта Беларусі?**

— На мой погляд, у нас усяго дастаткова для таго, каб праводзіць выбары Прэзідэнта. Больш за тое, я магу сказаць, што, калі ствараўся выбарчы кодэкс, многія яго нормы былі запазычаны з законаў Расійскай Федэрацыі. Гэта зараз яны адышлі ад нас далёка ў сувязі са зменай парламенцкай выбарчай сістэмы, партыйнымі спісамі і гэтак далей. Што ж датычыцца выбараў Прэзідэнта, то і ў нас, і ў іх — гэта цалкам мажарытарная сістэма. Трэба, каб за кандыдата прагаласавала абсалютная большасць насельніцтва. І ў іх вылучаюць грамадзян шляхам збору подпісаў, і ў нас.

У Расіі могуць быць нейкія асаблівасці, але яны звязаны з тым, што там выбарчая сістэма забяспечваецца чыноўнікамі — людзьмі, якія робяць гэта на прафесійнай аснове. Там іншае фінансаванне і зусім іншыя маштабы дзяржавы.

Што датычыцца саміх працэдур галасавання, то ў Расіі ёсць прасунутая тэхніка па падліку бюлетэняў. Адмысловыя прылады сцытваюць інфармацыю — і на працягу дзвюх хвілін падводзяцца вынікі выбараў. Усё гэта справа будучыні, па меры развіцця тэхналогій гэта паступова з'явіцца і ў нас.

**— У адным са сваіх інтэрв'ю вы казалі, што вам заўсёды хочацца пакінуць пасаду старшыні Цэнтрвыбаркама падчас перадвыбарчай кампаніі, а пасля — працаваць далей. Што вы адчуваеце з гэтай нагоды зараз? Ці бачыце вы для сябе годную змену?**

— Пакуль пра гэта казаць рана: мой тэрмін паўнамоцтваў дзейнічае да 2021 года. Нягледзячы на тое, што я дасягнула гранічнага ўзросту знаходжання на дзяржаўнай службе, распараджэннем кіраўніка дзяржавы мне дазволена працаваць да заканчэння тэрміну маіх паўнамоцтваў на гэтай пасадзе.

Адразу магу сказаць, што ў ЦВК прымаюцца меры для выхавання годнай змены. Гэта была мая ініцыятыва, каб пры вылучэнні новых членаў камісіі кожны рэгіён прадставіў кандыдатуру ў склад у рангу начальніка альбо намесніка начальніка ўпраўлення юстыцыі канкрэтнай вобласці. І Мінск, і ўсе вобласці — акрамя Віцебскай — прадставілі такіх людзей. Што можа быць лепш? Гэта маладыя кваліфікаваныя юрысты, якія ўвайшлі ў палітычнае асяроддзе, ездзяць на канферэнцыі і выбары, маюць зносіны з калегамі. Гэта будучыя кандыдатуры на пасаду старшыні Цэнтрвыбаркама.

У нас новы сакратар Цэнтральнай камісіі, якая таксама прыйшла з упраўлення юстыцыі. Я думаю, што яна таксама зможа замяніць мяне, калі прывыкне да ўвагі прэсы.

Я лічу, што заўсёды павінна быць замена, хоць на гэта месца, як правіла, трапляюць цалкам выпадковыя людзі. У асноўным — з іншага асяроддзя: напрыклад, былы дэпутат, чалавек з навукі, былы суддзя.

Галоўнае, што ёсць апарат, здольны працаваць на любога старшыню. Неабходна яго не разбурыць: у нас творчая атмасфера, наш самы малады супрацоўнік 24 гадоў можа лёгка зайсці да мяне ў кабінет і на роўных абмяркоўваць любое пытанне. Гэта і ёсць тое асяроддзе, у якім нараджаецца ісціна.

Ці хачу я зараз сысці? Ведаеце, пакуль у мяне не было падстаў для засмучэння ў гэтай выбарчай кампаніі. Спадзяюся, што яны і не з'явяцца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Хто ён — абраннік народа?

**Вячаслаў БАРАДУН, работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі, в. Бараўляны, Мінскі раён:**

— На мой погляд, сапраўднаму дэпутату неабходна мець рашучы характар. У яго павінна быць шчырае жаданне дапамагаць людзям, працаваць на карысць роднай краіны. Дэпутат — гэта абраннік народа. Ён павінен быць бліжэй да простых грамадзян, бачыць праблемы, клопаты насельніцтва і дапамагаць іх вырашыць.

Што датычыцца майго месца жыхарства, вядома, тут людзям неабходныя новыя школы і дзіцячыя садкі. З-за вялікай колькасці жыхароў заўсёды чарга ў адзіны банк. Таксама вельмі хацелася б упарадкаваць транспартныя зносіны раёна з горадам і суседнімі населенымі пунктамі. Актуальныя сёння і пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі, напрыклад, вельмі важна пабудаваць сучасныя станцыі хімічнай ачысткі вады.

**Ганна МІНЕЕВА, пенсіянерка, былая настаўніца, Маладзечанскі раён:**

— На маю думку, дэпутат павінен быць прыстойным чалавекам. Ведаць сваіх выбаршчыкаў і іх праблемы, часцей сустракацца з імі. Акрамя таго, ён павінен умець працаваць з выканаўчай уладай. Не ўступаць з ёй у канфлікт, а аргументавана і спакойна даводзіць сваё меркаванне.

Як правіла, пажаданні і наказы выбаршчыкаў свайму дэпутату ў асноўным падобныя. Хочацца нам, каб павышалася якасць медыцынскага абслугоўвання, жыллёва-камунальных паслуг, каб уладкоўваліся дарогі, развівалася сацыяльная сфера, у кватэрах былі цяпло і вада... Але прэтэндэнты на дэпутацкі мандат не павінны даваць пустых абяцанняў. Навошта такі дэпутат, які «клапоціцца» пра людзей толькі падчас выбараў. Вядома, ён не можа дабіцца ўсяго, што ўскладзена на яго выбаршчыкамі. Але няхай вызначае для сябе галоўныя напрамкі, пункты і настойліва па іх працуе.

**Лілія КУЗЬМІЧ, аграгарадок Парэчча Гродзенскага раёна:**

— Мы часта ківаем у бок дэпутата, маўляў, ён дрэнна працуе з выбаршчыкамі. Але гэта лягчэй за ўсё — крытыкаваць, казаць, што нічога не вырашаецца. Часам мы многа хочам ад дэпутата, але ён не можа ўсё зрабіць на мясцовым узроўні.

І ўсё ж нашы невялічкія запыты вырашаць ён павінен. Асабліва гэта датычыцца вуліц у населеных пунктах. Такія праблемы ёсць паўсюдна. Зразумела, што добраўпарадкаванне вуліц патрабуе фінансавых затрат, але дэпутат павінен дабівацца гэтага, і тады яго работа будзе відаць і людзі будуць удзячныя яму.

А ўвогуле трэба вылучаць у дэпутаты простых людзей, што называецца, з народа, якія на сваёй скуры зведалі патрэбы грамадства. Ну і, вядома, дэпутату трэба часцей сустракацца з народам, ісці, як кажуць, «у масы», каб людзі ведалі яго ў твар.

# АДЫСЦІ АД АБЫЯКАВАСЦІ...

*(Працяг. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Так што задачы перад дэпутатамі мясцовых Саветаў будуць пастаўлены вялікія. За намі — толькі людзі. І ні дэпутаты мясцовых Саветаў, ні дэпутаты парламента не маюць ніякага маральнага права заставацца ўбаку ад праблем сваіх выбаршчыкаў і чатыры гады проста адседжвацца. Мяркую, што выбаршчыкі таксама адказна і прынцыпова падыдуць да тых, за каго аддадуць свой голас. Бо хто, калі не яны, жыхары канкрэтнага пасёлка або невялікага горадка, лепш за іншых ведаюць сваіх землякоў? Спадзяюся, што ў мясцовыя Саветы будуць абраныя далёка не выпадковыя людзі.

***— З улікам патрабаванняў Прэзідэнта аб неабходнасці развіцця сельскіх тэрыторый якія падыходы ў рабоце мясцовых органаў улады неабходна ўдасканаліць? Якія праблемы, на ваш погляд, патрабуюць першачарговага вырашэння?***

— Самая вялікая і набалелая праблема малых гарадоў і пасёлкаў — працаўладкаванне мясцовага насельніцтва. Стварэнне новых працоўных месцаў дасць штуршок да далейшага развіцця сельскіх тэрыторый. Бо невыпадкова праблему адраджэння «малой радзімы» неаднаразова ўздымаў Прэзідэнт нашай краіны. Зусім нядаўна на рэспубліканскай нарадзе з працаўнікамі аграпрамысловага комплексу Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка прапанаваў абвясціць 2018 год у Беларусі Годам малой радзімы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на прыняцце такога рашэння паўплывалі развазанні пра важнасць малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. Нельга забываць свае вытокі, кім бы ты ні стаў. І Прэзідэнт нам паказвае асабісты прыклад у гэтым.

> Галоўнае, не заставацца ўбаку ад праблемы працаўладкавання і не спадзявацца, што зверху дадуць каманду, выдзеляць сродкі і прыедуць арганізаваць вам працоўныя месцы.

У мясцовых Саветаў дэпутатаў вельмі шмат магчымасцяў праявіць тут ініцыятыву. Трэба толькі адысці ад абыякавасці і падысці да праблемы творча. Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні неаднаразова прапаноўвала звярнуць пільную ўвагу на аб'екты нявыкарыстанай маёмасці. Дэкрэтам Прэзідэнта № 7 прадугледжваюцца вялікія магчымасці па развіцці прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці. Чаму б дэпутатам мясцовага ўзроўню не ўзяць ініцыятыву ў свае рукі: правесці растлумачальную работу сярод насельніцтва, арганізаваць кансультацыі юрыдычнага, эканамічнага кірункаў для тых, хто зацікаўлены ў праблеме працаўладкавання? Арганізаваць конкурс на найлепшы бізнес-план па стварэнні той ці іншай вытворчасці, нарэшце? Галоўнае, не заставацца ўбаку ад праблемы працаўладкавання і не спадзявацца, што зверху дадуць каманду, выдзеляць сродкі і прыедуць арганізаваць вам працоўныя месцы.

Дарэчы, у рамках падрыхтоўкі V Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі адно з мерапрыемстваў секцыі «Аграрная палітыка Саюзнай дзяржавы: вопыт, праблемы, перспектывы» плануем правесці на базе ААТ «Александрыйскае» Шклоўскага раёна. Прааналізуем вопыт развіцця сельскіх тэрыторый на прыкладзе стварэння і развіцця ўсім вядомага ў нашай краіне аграгарадка. Гэта будзе сумеснае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па мясцовым самакіраванні і Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным устройстве, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы. Назва мерапрыемства гаворыць сама за сябе: «Устойлівае развіццё сельскіх тэрыторый як найважнейшы



**Падчас выязнога пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў Дзяржынскім раёне.**

фактар забеспячэння эканамічнай бяспекі рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы».

***— Аляксандр Андрэевіч, у чым заключаецца праблема павышэння аўтарытэту мясцовых Саветаў дэпутатаў у насельніцтва? Чаго ім не хапае сёння? Магчыма, прыйшоў час удасканаліць адпаведнае заканадаўства?***

— Ніякага глабальнага ўдасканалення заканадаўства не патрабуецца. Заканадаўчая база дастатковая для таго, каб мясцовыя Саветы дэпутатаў разам з выканкамамі вырашалі галоўныя праблемы жыццезабеспячэння насельніцтва. Трэба толькі перамясціць прыярытэты з пазіцыі спажывальніцтва на пазіцыі стварэння. І, як я ўжо сказаў, у поўнай меры выкарыстаць свае правы, прадугледжаныя Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь».

Іншае пытанне, што ёсць некаторая нерашучасць з боку дэпутацкага корпуса, любыя дзеянні ажыццяўляюцца з аглядкай на выканаўчыя органы ўлады. Такія падыходы трэба мяняць. Я б нават сказаў, няверʼе ва ўласныя сілы, а часам і нежаданне быць на «перадавой». Бо хто, як не дэпутат, можа падняць і абʼектыўна данесці праблемы сваёй акругі, запатрабаваць ад службовых асоб выканання сваіх абавязкаў?

Прыкладаў актыўнай работы дэпутатаў мясцовых Саветаў нямала. На жаль, тыя народныя абраннікі, хто не на словах, а на справе пацвярджае ганаровае званне дэпутата, асабліва не афішуюць сваю работу, з чым я ў корані не згодзен.

Зараз на мясцовыя органы ўлады ўскладаецца асаблівая адказнасць за развіццё рэгіёнаў, і трэба быць да яе гатовымі.

Вялікую ролю ў рабоце з насельніцтвам іграюць і сродкі масавай інфармацыі. Хачу са станоўчага боку адзначыць вашае выданне, абноўлены дадатак да газеты «Звязда» «Мясцовае самакіраванне». Газета паступова становіцца пляцоўкай для выступленняў і дыскусій, на якой таксама публікуюцца і пазіцыі дэпутатаў усіх узроўняў: ад мясцовых Саветаў да членаў Савета Рэспублікі.

***— Як, на ваш погляд, павінна будавацца работа мясцовых органаў улады з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання?***

— Усяго ў нашай краіне створана амаль 37 тысяч органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання колькасцю больш за 55,5 тысячы чалавек. У тым ліку больш за сем тысяч чалавек, якія ўваходзяць у калегіяльныя органы, — гэта сельскія, вулічныя, дамавыя камітэты, і амаль 30 тысяч аднаасобных — старасты, старэйшыны і інш.

> Па сваёй сутнасці, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — велізарная сіла. Гэта людзі, якія могуць стаць не толькі сувязным звяном паміж органамі ўлады і насельніцтвам, але і рэальнымі памочнікамі ў вырашэнні многіх праблем.

І тут дэпутаты ўсіх узроўняў — і мясцовых Саветаў, і абедзвюх палат парламента — проста павінны дапамагчы людзям у арганізацыі такой ініцыятывы. Растлумачыць, як правільна наладзіць работу, прыняць удзел у грамадска карыснай працы. Мы павінны стварыць эфектыўную схему канструктыўнага супрацоўніцтва з грамадскімі аб'яднаннямі для вырашэння задач, якія не патрабуюць дадатковых выдаткаў і бюджэтнага фінансавання. Напрыклад, у частцы прывядзення ў парадак месцаў адпачынку, акультурвання прыдамавых тэрыторый і г. д. Мяркую, менавіта гэты кірунак узаемадзеяння з насельніцтвам можа стаць адным з крытэрыяў ацэнкі работы дэпутата.

***— Вернемся да праблемы стварэння новых працоўных месцаў у невялікіх гарадах і сельскай мясцовасці. Якую ролю ў яе вырашэнні можа адыграць супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі?***

— На цяперашні момант на ўзроўні абласцей Беларусь супрацоўнічае больш чым з 60 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Расійскі рынак па-ранейшаму застаецца прыярытэтным для нашага экспарту. На рэгіянальным узроўні актыўна развіваецца ўзаемавыгадны гандаль, ствараюцца сумесныя вытворчасці. Мы бачым вялікі патэнцыял аб'яднання намаганняў у аграрнай галіне. На наш погляд, першачарговай задачай супрацоўніцтва Беларусі і Расіі на гэтым этапе з'яўляецца фарміраванне адзінай аграрнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, якая мае на ўвазе стварэнне агульнага рынку, забеспячэнне харчовай бяспекі і стварэнне міждзяржаўных кааперацыйна-інтэграцыйных структур у АПК.

> Ёсць некаторая нерашучасць з боку дэпутацкага корпуса, любыя дзеянні ажыццяўляюцца з аглядкай на выканаўчыя органы ўлады. Такія падыходы трэба мяняць.

Умацаваць сувязі, якія ўжо ёсць, і стварыць новыя перспектывы супрацоўніцтва — галоўная мэта правядзення штогадовых Форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі. У рамках падрыхтоўкі і правядзення IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які адбыўся ў Маскве летам мінулага года, падпісана 77 дакументаў аб супрацоўніцтве (пагадненні, планы мерапрыемстваў, мемарандумы) паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадамі рэгіёнаў Расіі, паміж рэгіёнамі дзвюх краін. У мэтах выканання даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь наладжаны канструктыўны дыялог паміж прадстаўнічымі органамі ўлады. Так, падпісана 34 пагадненні паміж органамі мясцовага самакіравання (Саветамі дэпутатаў Беларусі і заканадаўчымі сходамі, абласнымі думамі, прадстаўнічымі сходамі, Саветамі дэпутатаў Расіі). Супрацоўніцтва рэгіёнаў нашых краін развіваецца не толькі паміж абласцямі, але і на базавым узроўні: пры падрыхтоўцы да Форуму падпісаны 41 дакумент аб супрацоўніцтве паміж раёнамі і гарадамі Беларусі і муніцыпальнымі ўтварэннямі Расіі, у тым ліку і мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

Пэўныя надзеі мы ўскладаем і на V Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які павінен адбыцца гэтым разам у нас у Беларусі, Магілёўскай вобласці. Тэматычныя секцыі гэтага маштабнага мерапрыемства пройдуць на пляцоўках вядучых прадпрыемстваў Магілёва і Шклова, а таксама Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

Вядома ж, ад Форуму мы чакаем аддачы. Спадзяёмся, што вынікам яго стануць сумесныя міждзяржаўныя праекты, рэалізацыя якіх дазволіць прыцягнуць дадатковыя працоўныя рэсурсы і стварыць новыя працоўныя месцы ў рэгіёнах нашай краіны.

***— Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі заклікаяны стварыць адзіны ланцужок супрацоўніцтва ўсіх прадстаўнічых органаў улады: ад Сельскага савета да Нацыянальнага сходу. Што ў гэтай рабоце, на вашу думку, стала найбольш значным вынікам?***

— На пасяджэннях Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання абмяркоўваем усе актуальныя праблемы жыцця нашага грамадства, якія найбольш хвалююць людзей. Пасяджэнні праходзяць, як правіла, у фармаце выязной нарады. На прыкладзе работы канкрэтных прадпрыемстваў і арганізацый мы абмяркоўваем самыя вострыя пытанні і намячаем шляхі выхаду са складаных сітуацый. Ролю і месца мясцовых органаў улады ў вырашэнні праблем фінансавай заможнасці і павышэння эфектыўнасці работы прадпрыемстваў АПК, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, удасканаленне заканадаўства па пітным водазабеспячэнні — гэта не поўны пералік праблем, якія абмяркоўваюцца падчас правядзення такіх выязных мерапрыемстваў. Мы даём магчымасць выслухаць пазіцыю органаў мясцовага самакіравання і данесці яе да рэспубліканскага ўзроўню, абмеркаваць усе пытанні за круглым сталом, дзе кожны мае права выказаць свой пункт гледжання і аргументаваць сваю прапанову.

Заўважу, што па кожным разгляданым пытанні былі распрацаваны прапановы і накіраваны ўраду для далейшага разгляду.

Так, па выніках сумеснага пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і Прэзідыума Савета Рэспублікі «Аб удасканаленні прававых, арганізацыйных і эканамічных асноў развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь па стварэнні спрыяльных умоў жыццезабеспячэння насельніцтва» выпрацаваныя намі прапановы ўвайшлі ў аснову Канцэпцыі ўдасканалення і развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Як вы ведаеце, гэта канцэпцыя ўжо зацверджана пастановай Саўміна ад 29 снежня 2017 года № 1037.

На пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні ў Лідскім раёне мы разгледзелі пытанне «Аб рабоце органаў мясцовага самакіравання па выкананні Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» у святле рэалізацыі выніковых дакументаў пятага Усебеларускага народнага сходу». Па выніках пасяджэння выпрацаваны рэкамендацыі па далейшай рабоце мясцовых Саветаў дэпутатаў і вызначаны асноўныя кірункі сумеснай дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання па рэалізацыі асноўных напрамкаў развіцця краіны на пяцігодку — **інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя і моладзь.**

*(Заканчэнне на 13-й стар. «МС».)*

■ У кадры

# ХТО ЛЯЦІЦЬ У ЛІСАБОН?

## Сённяшні вечар пакажа, ці дарэмна беларускія артысты баяліся ўкраінца Аляксеева

**На фінішную прамую гала-канцэрта, які пачнецца ўвечары ў самай вялікай студыі Белтэлерадыёкампаніі, выйшлі 10 удзельнікаў. Нагадаем, расійская вучаніца Пятра Ялфімава Сафія Лапіна, якая была ў гэтым спісе 11-й, зняла сваю заяўку (і неўзабаве падалася на адбор у Польшчу, але не прайшла). Астатнія ўлічылі заўвагі арганізатараў і працягнулі падрыхтоўку. Так, ужо тыдзень таму былі адзнятыя візітоўкі для кожнага артыста — сёлета гэта 30-секундныя ўключэнні са снежна-белага «пакоя ўспамінаў», — адбыліся папярэднія рэпетыцыі і агульны прагон, і ўсяго праз некалькі гадзін прамы эфір расставіць кропкі над «і».**

Памятаеце, з кага сёлета прафесійнаму журы і нам, гледачам, давядзецца выбіраць музычнага дэлегата? Каб зняць багаж вастрыню пытання «хто гэтыя людзі», «Звязда» прадстаўляе ўсіх кандыдатаў — у парадку выхаду на сцэну.

### 1. ADAGIO, «ТЫ І Я».



Кампазітар і прадзюсар Яўген Алейнік напаўжартам, напаўсур'ёзна сцвярджае, што гэты праект з усіх бакоў патрыятычны, бо ад пачатку да канца зроблены беларусамі. Словы і музыка — сямейнага і творчага дуэта Яўгена Алейніка і Юліі Быкавай, выканаўцы — ураджэнцы розных беларускіх гарадоў (Кобрына, Слуцка, Гомеля і Светлагорска). І вішанька на торце: песня на беларускай мове — адна з дзвюх, што прайшлі ў фінал адбору.

У салістаў на чацвярых — пара дзясяткаў Гран-пры і дыпломаў міжнародных вакальных конкурсаў у творчым багажы, абсалютна розныя манеры выканання, і пры ўсім тым такая «спетасць», нібыта хлопцы працуюць разам шмат гадоў, а не некалькі месяцаў. «Незалежна ад «Еўрабачання», мы вырашылі, што гурт Adagio працягне працаваць», — запэўніваюць артысты. Яны ўжо праехалі з прэс-турам па беларускіх гарадах, падрабязна расказваючы пра сябе, і... дэманстратыўна выклалі ў інтэрнэце ролік з пажаданнем удачы ўсім паймення сапернікам.

### 2. ALEKSEEV, «FOREVER»



Ураджэнец Кіева Мікіта Аляксееў з'явіўся на вялікай сцэне толькі ў 2014-м, калі ўзяў удзел у тэлешоу «Голас краіны». Але фурор ён выклікаў праз год з песняй «П'янае сонца», якая імгненна стала хітом і ўзнесла выканаўцу на вяршыні чартаў і хіт-парадаў адначасова ў Расіі, Украіне і Беларусі.

Ад удзелу ва ўкраінскім адборы на «Еўрабачанне» малады артыст адмовіўся і нават спыніў супрацоўніцтва са сваім прадзюсарам Русланам Квінтам — цалкам магчыма, таму, што апошні сёлета ўзначальвае ўкраінскі адбор. Падавацца ў Расію таксама не было сэнсу — аб тым, што на конкурс едзе спявачка Юлія Самойлава, вядома яшчэ з 2017-га. Таму спроба заваяваць пуцёўку ад Беларусі цалкам лагічная. Праўда, і тут не ўсё адназначна. Хоць у конкурснай песні «Forever» была часткова зменена мелодыя, яна ўсё яшчэ нагадвае рускамоўную «Навсегда», якая гучала на канцэртах яшчэ летась... Так што частка беларускіх артыстаў загадзя апалчылася на «легіянера», і адбор атрымаўся нервовым.

### 3. SHUMA, «ХМАРКІ»



Электра-фолк-гурт Shuma — бадай, самая свежая і прыемная неспадзяванка сёлетняга адбору. Лідар праекта Руся Шукюрава вядомая як збіральніца калекцыі сімвалаў беларускага арнаменту, «голас» беларускай чыгункі, прафесійны дублёр кіно і трэнер па кіраванні галасам, але перадусім як даследчыца архаічных беларускіх спеваў.

«Мы не тое каб даспелі да конкурсу альбо так ужо натхніліся леташнім прыкладам Naviband, — растлумачыла Руся, чаму замахнулася на еўравізійную сцэну, — проста разумеем, што «Еўрабачанне» — выдатная медыяплатформа, і праз такія конкурсы можна як мага большай аўдыторыі расказаць пра наш, беларускі, культурны прадукт». Песня, якую прадставіў гурт, — сплаў сучаснай моднай электроннай музыкі і народнага тэксту. Праўда, словы па рэкамендацыі арганізатараў адбору давялося перапрацаваць, каб не парушаць правілы «Еўрабачання». І ўсё ж гіпнатычны трэк Shuma абяцае стаць адной з самых яркіх частак фіналу.

### 4. NAPOLI, «CHASING RUSHES»



Вольга Шыманская апошнім часам жыве і працуе на Кіпры, але мары прадставіць Беларусь на еўравізійнай сцэне не пакідае. Вось ужо пяць гадоў запар спявачка ўдзельнічае ў беларускім адборы — і штораз, заўважым, даходзіць да фіналу.

Гэтым разам Вольга зрабіла стаўку на еўрапейскі матэрыял: у яе конкурснай песні — брытанскія аўтары і празрыстасць змест пра вечнае памкненне чалавечай душы да шчасця. Як прызнаецца артыстка, летась на эмоцыях яна паабяцала сабе больш ніколі не звязвацца з «Еўрабачаннем», але дасланая аўтарамі песня здалася ёй настолькі блізкай і асабістай, што вырашыла: гэтым абавязкова трэба падзяліцца са слухачамі.

### 5. АНАСТАСІЯ МАЛАШКЕВІЧ, «WORLD ON FIRE»



Спявачка, педагог па вакале, артыстка Вялікага тэатра оперы і балета, удзельніца тэлепраектаў «Голас краіны», чэмпіёнка краіны па караоке, двойчы фіналістка беларускага адбору на «Еўрабачанне» — вось толькі сціслая вытрымка з творчага рэзюмэ Анастасіі.

Сёлета ў актыве артысткі — не толькі магутны «оперны» вакал, але і песня ад пладавітых і даволі папулярных у еўравізійных колах аўтараў, шведак-сясцёр Ілвы і Лінды Персан (толькі сёлета пяць іх кампазіцый увайшлі ў фіналы нацыянальных адбораў у розных краінах!).

### 6. ГЮНЕШ, «I WON'T CRY»



Адметны голас, сцэнічны вопыт, упартасць у дасягненні мэты — тыя якасці, з якімі Гюнеш скарыла не адзін музычны конкурс. На альтэрнатыўным «Еўрабачанню» конкурсе Turkvision пяць гадоў таму беларуска заняла другое месца, але гэтага ёй відавочна мала.

Сёлета 7-разовая ўдзельніца нацыянальнага адбору паспытае шчасця з кампазіцыяй ад прызнаных профі — удзельнікаў культавага шведскага гурта Secret Service Ціма Норэла і Улы Хакансана, а таксама заснавальніка гурта Army of Lovers Аляксандра Барда. Над гэтай кампазіцыяй артыстка працавала ў Стакгольме, і можна не сумнявацца, што ў ёй выверана кожная нотка.

### 7. РАДЫЁХВАЛЯ, «SUBWAY LINES»



Раней музычная суполка была кавер-бэндам і перапявала чужыя хіты, аднак паступова назапасіла сцэнічны вопыт і ўласны рэпертуар. Вакаліст Улад Чыжыкаў мае ў актыве перамогу на тэлепраекце «Акадэмія талентаў» і дыпломы шэрагу міжнародных і нацыянальных конкурсаў. З іншых цікавых фактаў пра гурт вядома, што агульны ўзрост яго ўдзельнікаў складае 118 гадоў, а сумарны музычны стаж перавышае паўстагоддзя.

Дарэчы, у 2016-м калектыў ужо даходзіў да фіналу беларускага адбору на «Еўрабачанне», але тады для больш ці менш сур'ёзнага выніку чагосьці не хапала. Сёлета ж — калі ласка, немалое фанацкае кола, стапрацэнтная лірычная балада і прадстаўлены тыдзень таму дэбютны альбом у яе падтрымку.

### 8. ALEN HIT, «I DON'T CARE»




Алег Шчуцкі адлічвае сцэнічную кар'еру з 2011 года, калі паспрабаваў сілы ў адборы на «Новую хвалю». Потым юнак — на хвілінечку, веб-дызайнер па адукацыі — атрымаў Нацыянальную музычную прэмію як «Адкрыццё года», засвяціўся ў розных краінах у тэлепраектах «Акадэмія талентаў», «Голас», «Х-фактар» і канчаткова зрабіў выбар на карысць музыкі.

«Еўрабачанне» ён штурмуе ўжо трэці раз, сёлета з песняй у стылі фанк. «Я жыву з такой палітыкай, што сам для сябе галоўны канкурэнт, мне трэба выступіць лепш, чым раней, увайсці ў пяцёрку найлепшых — гэта галоўная мэта. А ўжо якое месца займу, няхай вырашаюць гледачы і журы», — спакойна разважае артыст, абяцаючы ўразіць гледачоў танцамі і эфектным нумарам.

### 9. LEXY WEAVER, «AIN'T YOU»



17-гадовая мінчанка Аляксандра Ткач — самая юная фіналістка нацыянальнага адбору, якая гучна заявіла аб сабе яшчэ летась. Вакалам дзяўчына займаецца менш як пяць гадоў, затое сама піша словы і музыку да сваіх песень і ўжо мае за плячыма некалькі перамог у творчых спаборніцтвах.

Можна, зразумела, пакпіць, што не вельмі складана быць спявачкай, калі ў цябе тата — прадзюсар. А можна прыглядзецца і прыслухацца да Аляксандры і ацаніць яе ўласны талент і манеру выканання, якія асобна адзначыў нават старшыня прафесійнага журы беларускага адбору Валерый Дайнека.

### 10. КІРЫЛ ГУД, «DEJA VU»



Яшчэ дзесяць гадоў таму Кірыл Ермакоў упершыню (а потым яшчэ двойчы) удзельнічаў у адборы на дзіцячае «Еўрабачанне». Быў вядучым хіт-парада «Сто песень для Беларусі», спрабаваў сілы ў тэлепраектах «Акадэмія талентаў» і «Голас», таксама як у адборы ўжо на дарослае «Еўрабачанне».

Сёння Кірыл працуе ў Маскве, паспяхова піша і аранжыруе модныя песні для сябе і іншых выканаўцаў — у тым ліку, напрыклад, расійскай спявачкі Валерыі. Сваю ж конкурсную песню спявак напісаў у тандэме з вядомым на беларускай эстрадзе аўтарам слоў Раманам Калодкам.

...Хто з дзясяткі фіналістаў выйграе шчаслівы білецік у Лісабон? Вырашаць у тым ліку вам, шаноўная публіка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота прэс-службы БТРК і з сацыяльных сетак**

■

**Тым часам**

Пакуль інтрыга вакол дарослага «Еўрабачання-2018» толькі закручваецца, падрыхтоўка да дзіцячага конкурсу, які сёлета другі раз прымае Беларусь, праходзіць у штатным рэжыме. Днямі Мінск наведалі прадстаўнікі назіральнай рады «Еўрабачання» з Расіі, Грузіі, Італіі, Мальты і Нідэрландаў. Госці абмеркавалі з кіраўніцтвам Белтэлерадыёкампаніі арганізацыйныя пытанні, а таксама ацанілі «Мінск-Арэну» як адну з магчымых пляцовак для правядзення шоу, выставачны цэнтр «БелЭкспа», які прапануецца ў якасці месца ўрачыстага адкрыцця форуму, і гасцінічны комплекс «Прэзідэнт-Атэль», дзе ўжо ў лістападзе пачне дзейнічаць Еўраклуб і будуць жыць дэлегацыі ўдзельнікаў.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Усе робяць памылкі, і мудрасць жыцця заключаецца ў тым, каб іх не паўтараць, не хадзіць па замкнёным коле, а здабываць пазітыўны вопыт з жыццёвых цяжкасцяў. Ваша задача зводзіцца да назапашвання энергіі і чакання больш спрыяльных момантаў для дзеянняў. Вывучайце сітуацыю, але не спяшайцеся. Калі прыйдзе час дзейнічаць — вы гэта адразу зразумееце і адчуеце.

**СКАРПІЁН.** Творчая дзейнасць будзе станоўча ўплываць на ваш настрой і працаздольнасць. Калі давядзецца ў панядзелак адстойваць перад навакольнымі новыя ідэі, не хвалюйцеся, начальства прызнае вашу слушнасць. Каб не натыкацца на перашкоды, неабходна імкнуцца да таго, чаго ў вас яшчэ не было ў жыцці. У сераду і чацвер плануйце рашучыя дзеянні, пачатак новага праекта, не выпускайце свой шанц, выкарыстоўвайце спрыяльны момант. Але знайдзіце час і на рамантыку.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні шмат станоўчай дынамікі, усё адбываецца раптоўна і не па плане, але затое складваецца ўдала, можна нават сказаць, што найлепшым чынам. Фартуна будзе ўсміхацца. Варта задумацца пра будучы адпачынак, і калі ў вас ёсць магчымасць, то выбірайце тур у якую-небудзь экзатычную краіну. У пятніцу вас будуць спакушаць прывабнай дзелавой прапановай, ад якой будзе нялёгка адмовіцца.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні з'явіцца жаданая свабода дзеянняў, але ёю неабходна разумна распарадзіцца. Час будзе звязаны са зносінамі, усталяваннем кантактаў і заключэннем здзелак. Не выключана і ўзнікненне спрэчных момантаў, што могуць спарадзіць рознагалоссі. У сераду анархічны настрой і нежаданне нікому падпарадкоўвацца можа прынесці расчараванне і непатрэбныя страты.

**ВАДАЛІЎ.** Нягледзячы на тое, што вы будзеце схільныя лунаць у аблоках і аддавацца рознага роду фантазіям, рэкамендуецца заняцца надзённымі справамі. Асабістае абаянне дазволіць наладзіць неабходныя партнёрскія адносіны ў дзелавой сферы. У сярэдзіне тыдня верагодны непрацяглыя паездкі. Пачынаючы з пятніцы, уладзяцца сямейныя праблемы, пачнецца перыяд поўнага паразумення. Неспрыяльны дзень — аўторак, калі занадта вялікая верагоднасць канфліктаў.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні вы адчуеце лёгкасць, сыдзе ў мінулае многае з таго, што вас раздражняла. Першая палова тыдня спрыяльная для актыўных зносін у нефармальным ключы. Залішняя строгасць можа адпудзіць каго заўгодна, паспрабуйце быць больш таварыскімі. У чацвер прыйдзецца праявіць цярпенне, каб пазбегнуць канфліктаў з начальствам. У пятніцу ёсць рызыка выдаткаваць занадта шмат часу або грошай, прычым марна. У выхадныя дні паслухайце ўнутраны голас, ён не падмане.

## Чацвер, 22 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.55** «Зона Х» (16+).
**9.10, 23.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Хросны» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».



**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Паміж намі, дзяўчынкамі» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Алімпійскі дзённік. Пхёнчхан-2018.
**22.15** «Армія Беларусі. Летапіс стагоддзя». Дак. фільм.
**0.40** «Сфера інтарэсаў».
**1.35** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца». (12+).
**9.00, 19.30** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.35 «Сляпая». Серыял. (16+).**
**10.20, 17.35 Серыял «Ганна-дэтэктыў». (16+).**
**12.25,21.30, 22.05** «Арол і рэшка. Юбілейны». (16+).
**13.20, 20.35** «Паненка-сялянка». (16+).
**14.20** «На нажах». (16+).
**15.20, 22.35 Серыял «Каварныя пакаёўкі». (16+).**
**16.15, 0.15** «Нічога сабе ньюз». (12+).
**16.20, 0.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.05** «Багіня шопінгу». (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 20.15** «Беларуская кухня». Запечаны кавун.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.35 «Ганна Герман». Маст. фільм (12+).**
**9.20, 18.00** «Каралі эпізоду». Георгій Міляр (12+).
**10.00** «Камертон». Народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў.
**10.25, 16.15 «Батанічны сад». Маст. фільм.**
**12.20, 23.15** «Легенды музыкі». Аляксей Рыбнікаў (12+).
**12.45** «Славянскі базар у Віцебску — 2011».
**13.40** «Наперад у мінулае».
**14.05, 22.30** «Вызваліцелі. Пяхота». Дак. серыял (12+).
**14.50, 21.05 «Вызваленне». Драма. «Бітва за Берлін» (12+).**
**19.30** «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака». Уладзімір Ганчарук.
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.10** Пхёнчхан-2018. Хакей. Фінал. Жанчыны.
**10.00** Пхёнчхан-2018. Гарналыжны спорт. Слалам. Мужчыны. Шорт-трэк. Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.
**14.10, 19.20** Пхёнчхан-2018. Біятлон. Эстафета. Жанчыны.
**15.45** Тэніс. Турнір WTA. Дубай.
**18.00** Авертайм.
**18.30** Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
**19.00, 1.00** Пхёнчхан-2018. Вынікі дня.
**20.55, 23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Матч у адказ. (У перапынку — Спортцэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Барселона-92. Апошняе золата» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Удача ў прыдачу!» Дзённік. Спецвыпуск (12+).
**21.15 Серыял «Вольная грамата». (16+).**
**23.15 Серыял «Медсястра» (12+).**
**1.05** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**8.50, 21.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40, 20.15** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 21.55** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50, 17.50 «Жорсткі бізнес». Серыял (16+).**
**13.50, 23.25 «Баец». Серыял (16+).**
**15.20** «Далёкія сваякі» (16+).
**15.40** «Легенды СССР» (16+).
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**1.00 «Медыкі». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**7.00 Серыял «АСА» (16+).**
**10.40, 13.15 Серыял «Участак». (12+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**16.45, 2.40 Маст. фільм «Фокуснік» (16+).**
**19.20 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (12+).**
**21.15** Канцэрт «Калі спяваюць мужчыны» (16+).
**22.45, 0.10 Маст. фільм «Пра беднага гусара закіньце слова» (12+).**
**0.00** Навіны апоўначы (бягучы радок).
**2.10** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**4.35** «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 22.30, 23.10 Серыял «Крывавая пані». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.40 Маст. фільм «Камунальны дэтэктыў». (12+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**0.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след». (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы». (16+).**
**9.40, 23.05** «НЗ.by».
**10.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**14.20 Серыял «Хвост». (16+).**
**16.35, 19.40 Серыял «Куба». (16+).**
**21.20 Серыял «Неўскі. Праверка на трываласць». (16+).**
**23.25 Серыял «Бальзакаўскі ўзрост, або Усе мужыкі — сво...» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.10 Серыял «Дама пад вуаллю» (16+).**
**9.05, 20.00 Серыял «Дэтэктыўнае агенцтва «Месяцавае святло» (16+).**
**10.00** «Кава з перцам».
**11.00 Камедыя «За бортам» (12+).**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.20 Вестэрн «Апачы» (12+).**
**16.00** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**17.00** Шок і шык.
**17.20 Серыял «Горад прышэльцаў» (16+).**
**18.45 Серыял «Абаронца» (16+).**
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Меладрама «Апошні гарэм» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20, 4.05** М/ф «Ліга Watchcar». (0+)
**7.50, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.10, 4.50** М/ф «Джынглікі». (0+)
**8.30, 3.20** «Ералаш». (6+)
**9.20** Серыял «Гэта каханне». (12+).
**10.20** Баявік «Місія невыканальная-3». (12+).
**12.40** Скетч-шоу «Студэнты». (16+).
**13.00, 20.00** «Супермамачка». (16+).
**14.10, 2.30** Серыял «Збеглыя сваякі». (16+).
**16.50, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.45** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Каманда Б». (16+).
**21.10** Баявік «Місія невыканальная: пратакол фантом». (12+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.40** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Джульета Мазіна.
**7.05** «Пешшу...» Масква сядзібная.
**7.35, 20.05** «Правілы жыцця».
**8.10, 22.20** «Ціхі Дон». Серыял, заключная серыя.
**8.55, 18.40** «Чыстая перамога. Сталінград».
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10** ХХ стагоддзе. «Аляксандр Пакрышкін». Дак. фільм.
**12.10** Дзённік XI Зімовага міжнароднага фестывалю мастацтваў Юрыя Башмета.
**12.30** «Зорка Казакевіча». Дак. фільм.
**13.10** «Герард Меркатар». Дак. фільм.
**13.20** «Абсалютны слых».
**14.05, 20.45** «Разгадка тайн Мачу-Пікчу». Дак. фільм.
**15.10, 1.25** Майстар-класы членаў журы конкурсу «Шчаўкунок». Дзмітрый Башкіраў.
**15.50** «Мая любоў — Расія!» «Хурэш — танец арла».
**16.25** «Лінія жыцця». Таццяна Міхалкова.
**17.15, 2.10** «Аўстрыя. Зальцбург. Палац Альтэнау». Дак. фільм.
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма. Дзмітрый Чарнякоў».
**23.10** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Борачка». Барыс Давыдавіч Літвак».
**0.00** «Апошні рыцар імперыі. Іван Саланевіч». Дак. фільм.
**2.40** «Іншы бок». «Вецер уздоўж берага». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkoўскім: «Злачыннасць: да і пасля перабудовы». 2006 год (16+).
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 14.40, 15.40, 17.00, 19.05, 21.40, 23.45, 2.40, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Будзь здароў, дарагі!» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. 2005 год (12+).
**13.15** Праграма «Вакол смеху». 1987 год (12+).
**17.15** Фільм-канцэрт «Бенефіс Савелія Крамарава». 1974 год (12+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Армейскія байкі». 2005 год (16+).
**19.20** «Сустрэча ў канцэртнай студыі «Астанкіна» з Ваўкагонавым Дзмітрыем». 1990 год (16+).
**23.05** Фільм-канцэрт «Зімовы вечар... у Лужніках!» 1989 год. 1-я частка (12+).
**0.00** Фільм-спектакль «Дзядзька Ваня». (16+).
**2.50** М/ф «Пластылінавая варона». (0+).
**5.00** Праграма «Рытмы планеты». 1985 год (12+).

### EuroSport 1

**3.00, 17.30, 22.00, 2.45** Пхёнчхан-2018. «Алімпійскія гульні»-экстра.
**3.40, 7.30, 9.30, 11.30, 19.30, 21.30, 0.00** Пхёнчхан-2018. Горныя лыжы.
**5.30, 2.30** Пхёнчхан-2018. Фрыстайл.
**6.45** Пхёнчхан-2018. Снаўборд.
**8.45 20.30, 1.30** Пхёнчхан-2018. Хакей.
**10.00, 12.15** Пхёнчхан-2018. Алімпійскія навіны.
**10.15, 12.30, 18.00, 23.15** Пхёнчхан-2018. Лыжнае дваяборства.
**14.15, 18.45, 22.40** Пхёнчхан-2018. Біятлон.
**15.45** Пхёнчхан-2018. Кёрлінг.
**17.00, 0.30** Пхёнчхан-2018. Шорт-трэк.
**20.00, 1.00** Пхёнчхан-2018. Экстрым.
**21.00, 2.00** Пхёнчхан-2018. Лыжныя віды.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Праклён нефрытавага скарпіёна». (16+).
**2.45** Камедыя «Бамбіза Салмон». (16+).
**4.40** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі». (12+).
**6.35** Камедыя «Дзядуля лёгкіх паводзінаў». (18+).
**8.35** Камедыя «Закахаць і абясшкодзіць». (12+).
**10.45** Камедыя «Эйс Вентура: вышук хатніх жывёл». (12+).
**12.20** Камедыя «Superнянь». (16+).
**14.00** Камедыя «Разбіраючы Гары». (16+).
**15.45** Меладрама «Нерэальнае каханне». (16+).
**17.20** Камедыя «Піпец». (18+).
**19.30** Драма «Усё пуцём!» (16+).
**21.20** Камедыя «Канікулы мары». (12+).
**23.10** Камедыя «Галоўнае — не баяцца». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.20** «Доктар І...» (16+).
**8.50, 19.00, 3.35** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.35** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.15, 18.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**13.05, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.05, 5.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.00** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.35** «Простыя складанасці» (12+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**21.00** «Украдзенае вяселле». Серыял (12+).
**22.00** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**23.00** «90-я» (16+).
**23.50** «Нябёсы, якія абрынуліся». Серыял (16+).
**0.40** «Стартап». Серыял (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.45** Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу (16+).
**8.35** Малавіта (16+).
**10.45** Блакітная лагуна (16+).
**12.55** Чытальнік (16+).
**15.20** Тры метры над узроўнем неба (16+).
**20.10** Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая (16+).
**22.40** Кіт (16+).
**0.35** Вяртанне ў Блакітную лагуну (16+).
**2.35** На краі (16+).
**4.00** Пераправа-2 (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя. Джэкпот (16+).
**8.05** Дурань (16+).
**10.25** Даўн Хаус (16+).
**12.10** Волга-Волга (0+).
**14.15** Палюбоўнік (16+).
**16.20, 4.20** Як выйсці замуж за мільянера-2 (12+).
**18.15** Цёмны свет (16+).
**20.20** Слон (12+).
**22.10** Закахаць і абясшкодзіць (12+).
**0.25** Жывы (16+).
**2.20** Пра што гавораць мужчыны (16+).

### National Geographic

**6.00, 5.40** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**6.45** Узлом Сістэмы. (16+).
**7.05, 10.10** Цуды інжынерыі. (12+).
**7.55, 11.45** Сапраўдны суперкар. (12+).
**8.35, 17.10, 20.25** Аўта-SOS. (12+).
**9.25** Інстынкт выжывання. (16+).
**11.00** Шаша праз пекла. (12+).
**12.30** Неверагодныя машыны. (12+).
**13.15** Займальная навука. (12+).
**14.00** Навука будучыні. (12+).
**14.50** Тайны Гроба Гасподняга (16+).
**15.35** Суперзбудаванні. (12+).
**16.25, 18.00, 19.35, 0.15, 3.20** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**18.45** Скрытая грабніца Чынгісхана (12+).
**22.45** Карта пекла (16+).
**1.45** Паранармальнае. (16+).
**2.35** «Джон Ф. Кенэдзі: куля, якая знікла» (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 11.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной.
**18.00** Металаломшчыкі.
**19.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**20.00, 0.00** Залатая ліхаманка.
**2.00** Аляска: апошні рубеж.
**2.55** Маланкавыя катастрофы.

У красавіку 2017 года на базе Дзяржынскага раёна намі была вывучана работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання Мінскай вобласці па ўключэнні ў гаспадарчы абарот нявыкарыстанай і не эфектыўна выкарыстанай маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці. Удзельнікі нарады прыйшлі да высновы аб неабходнасці змены заканадаўства, якое рэгулюе маёмасныя адносіны. Мы накіравалі свае прапановы ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. І хачу адзначыць, што нам удалося зрушыць пытанне з мёртвай кропкі. Прапановы ўлічаны пры падрыхтоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў.

***— Нядаўна ў Паставах адбылося сумеснае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і Праўлення Белкаапсаюза, прысвечанае павышэнню якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва. Як узаемадзеянне мясцовых органаў улады і спажыўкааперацыі можа вырашыць праблемы занятасці, павышэння ўзроўню жыцця людзей?***

— Падчас наведвання гандлёвых аб'ектаў і прамыслова-перапрацоўчага комплексу Пастаўскага раёна падымаліся пытанні, якія датычацца выканання даручэнняў Прэзідэнта па паляпшэнні фінансавага стану прадпрыемстваў Белкаапсаюза, павышэнні іх эфектыўнасці і даступнасці паслуг для людзей. Сёння першачарговая задача спажывецкай кааперацыі і ўсіх яе структурных падраздзяленняў — актыўны ўдзел у фарміраванні даходнай часткі бюджэту свайго рэгіёна. Спажыўкааперацыя заклікана стаць пасярэднікам паміж вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі і рынкам. Трэба ствараць новыя працоўныя месцы, адкрываць цэхі перапрацоўкі, выпускаць прадукцыю з дабаўленай вартасцю.

> Наспела неабходнасць стварэння дакладнай сістэмы ўзаемадзеяння выканаўчай улады з дэпутатамі, якая будзе накіравана на развіццё эканомікі канкрэтнага рэгіёна.

Удзельнікі пасяджэння прыйшлі да думкі, што ў арганізацый спажыўкааперацыі ёсць вялікі рэсурс. Напрыклад, закупка сельскагаспадарчай прадукцыі — важны складнік дзейнасці спажыўкааперацыі. Яна заўсёды займалася пытаннямі закупак сельскагаспадарчай прадукцыі там, дзе яна маецца з лішкам, і рэалізацыі там, дзе яе недастаткова. І гэта вельмі важна, бо па статыстыцы даход сям'і, якая пражывае ў сельскай мясцовасці, на 13,7 % складаецца з паступленняў ад асабістай падсобнай гаспадаркі, на 9,8 % — з нарыхтоўчай дзейнасці. У сельскай мясцовасці даходы насельніцтва невялікія, і такая крыніца заробку, наладжаная арганізацыямі спажыўкааперацыі, вельмі адчувальная для сельскіх жыхароў. У гэтую работу варта таксама ўключыцца і мясцовым органам улады, праводзіць тлумачальную работу з насельніцтвам, бо 17,2 % сельскіх жыхароў не ведае, што лішкі прадукцыі закупляе Белкаапсаюз. І нарыхтоўчыкі павінны больш актыўна ісці да людзей. Часам складваецца сітуацыя, што чалавек, які выгадаваў сваю прадукцыю, і рады яе прадаць арганізацыі кааперацыі, але тэрытарыяльна такой магчымасці ў яго няма. Гэта, у тым ліку, адно з рашэнняў праблемы занятасці насельніцтва.

***— Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь што вы хацелі б пажадаць кандыдатам у дэпутаты і іх выбаршчыкам?***

— Кандыдатам у дэпутаты, вядома ж, жадаю быць абранымі. Але ў той жа час хачу даць параду. Будзьце сумленнымі са сваімі выбаршчыкамі. Не трэба даваць нязбытных абяцанняў, лепш настроіцца на плённую работу.

Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў — вельмі важнае і адказнае мерапрыемства дзяржаўнага ўзроўню. Спадзяюся, што ўсе выбаршчыкі праявяць грамадзянскую актыўнасць і прагаласуюць за самых годных сваіх прадстаўнікоў. Бо задача ў нас усіх адна — сваёй працай стварыць умовы для годнага жыцця ў стабільнай эканамічна развітой краіне.

**Гутарыла Наталля БІТЭЛЬ.**

ДАТЭРМІНОВА!

# І скрынка для наказаў

**Самай першай на выбарчы ўчастак у вёсцы Вістычы Брэсцкага раёна прыйшла пенсіянерка Ганна Шэйда. Аказваецца, Ганна Ільінічна заўсёды праяўляе грамадзянскую актыўнасць і прыходзіць раней за ўсіх. «Жыву блізка, навошта адкладваць на апошні дзень?» — растлумачыла выбаршчыца.**


Фота Сяргея ХМЕЛЯ.

**Член камісіі Вольга ДРОБЫШАВА і выбаршчыца Валянціна СКУЛАВЕЦ.**

Тым і адрозніваецца вясковы выбарчы працэс ад гарадскога, што члены камісіі і выбаршчыкі ведаюць адно аднаго. Старшыня камісіі Алена Макоўская кажа, што Ганна Ільінічна вельмі абавязковы чалавек, але апошнім часам яе падводзіць здароўе. Калі самаадчуванне трошкі лепшае, для жанчыны гэта нагода выйсці ў людзі. Мясцовыя жыхары прыходзяць аддаць галасы, але паспяваюць абмеркаваць і нюансы вулічнага асвятлення, і вясковыя святы, і стан дарог на новых вуліцах. Так, за гадзіну на выбарчым участку давялося, напрыклад, пачуць, што не ўсе задаволены правядзеннем раённага свята «Вістыцкі яблык». Апошняе трэба растлумачыць. У Вістычах знаходзіцца сельскагаспадарчае прадпрыемства «Агра-сад «Світанак». Адным з кірункаў ААТ з'яўляецца вытворчасць яблыкаў, і ўжо некалькі гадоў запар у жніўні тут праводзяць адпаведнае раённае свята. «Вістыцкі яблык» стаў святам для ўсяго раёна, а вось дзень вёскі праводзіць перасталі, і яго ў нас цяпер няма», — кажуць выбаршчыкі. Вось вам і пытанне для сесіі новага склікання мясцовага Савета. Дарэчы, з самага пачатку выбарчай кампаніі ў Доме культуры паявілася скрынка для наказаў выбаршчыкаў. Можа, і гэты ўжо атрымаў нехта з кандыдатаў?

Людміла Петручук, шматдзетная маці, ніякіх праблем не агучвала, — хутка прагаласавала і пабегла па справах, сказаўшы, што на выхадныя ў іх запланаваная паездка. Занятымі выхаднымі растлумачыў датэрміновае галасаванне і Дзмітрый Платніцкі. Малады спецыяліст, ветурач мясцовай гаспадаркі, працуе нядаўна. Для сям'і атрымаў домік у вёсцы. Прозвішча Дзмітрыя давялося занесці ў дадатковы спіс, бо ён зарэгістраваўся адносна нядаўна.

Алена Макоўская хутка запаўняе дакументы — чалавек яна вопытны, у камісіях удзельнічае шмат гадоў. Алена Леанідаўна бібліятэкар, многія з яе выбаршчыкаў з'яўляюцца чытачамі. Расказвала, што ў першы дзень датэрміновага галасавання адзін з вяскоўцаў прынёс здаць кнігі, яго запрашалі зайсці і на ўчастак. Але чалавек запярэчыў, сказаў, што прывык хадзіць на выбары ў дзень галасавання.

— І гэта яго права, — зазначае старшыня камісіі. — Многія сапраўды ўспрымаюць дзень выбараў як свята яшчэ з савецкіх часоў. Ёсць у нас цудоўны чалавек, былы педагог, 93-гадовая Нінэль Антонаўна Навуменка. Яна прыходзіць менавіта ў дзень выбараў, усіх віншуе з гэтай падзеяй, стараецца ўбачыць паболей аднавяскоўцаў. Акрамя прыезджых, усе яе былыя вучні, яна выкладала ў школе родную мову і літаратуру.

Вольга Дробышава, член участковай выбарчай камісіі, дадала, што ў нядзелю паедзе са скрынкай у аддаленыя вёскі. «Многія пажылыя людзі вельмі чакаюць нас, бабулькі надзяваюць святочныя хустачкі і з ранку выглядваюць у вокны. Выязныя скрынкі гатовыя — вунь стаяць!» А скрынкі для галасавання на ўчастку празрыстыя. Супрацоўніца дзіцячага садка Валянціна Скулавец запоўніла бюлетэнь вельмі хутка. Было бачна, што Валянціна Уладзіміраўна загадзя ведала, за каго і як галасаваць. У Брэсцкі абласны Савет у гэтай акрузе балатуецца два кандыдаты, у астатніх — па адным.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ВЯЛІКІЯ МЭТЫ ПАЧЫНАЮЦЦА З МАЛЫХ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Трое студэнтаў, якія вучацца на аўтатрактарным факультэце па спецыяльнасці «транспартная лагістыка», прыйшлі ў пункт галасавання разам. Алена Баніна з Салігорска і Іван Нікалаенка з Мазыра сёлета спрабуюць сябе ў ролі выбаршчыкаў упершыню. А вось маладзечанец Іван Карыцька ўжо галасаваў на парламенцкіх выбарах паўтара года таму. Цяпер малады чалавек гаворыць з сябрамі з веданнем справы, яшчэ раз тлумачыць, як і што трэба рабіць.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пытаемся, ці ведаюць яны, чым займаюцца дэпутаты мясцовых Саветаў. У адказ маладыя людзі ўпэўнена ківаюць.

— Паляпшаюць... — пачынае разважаць Алена, — ...грамадскае і культурнае жыццё нашага горада, — заканчвае фразу Іван.

Выбар зрабіць было не цяжка: звесткі пра кандыдатаў вывучылі загадзя —інфармацыйныя плакаты звяртаюць на сябе ўвагу. Юныя выбаршчыкі лічаць, што галоўнае — гэта самапрэзентацыя. А «гавораць» за чалавека і яго адукацыя, і пасада, і нават фатаграфія.

Пра тое, якія змены да лепшага патрэбны асабіста ім, маладыя людзі даюць адказ практычна не задумваючыся. Галоўных пунктаў усяго два: палепшыць умовы пражывання ў інтэрнаце і зрабіць праезд у грамадскім транспарце — хоць бы ў аўтобусе — бясплатным. Цяпер на гэта выдаткоўваецца значная частка стыпендыі.

А як накошт таго, што варта было б палепшыць у іх родных гарадах? «Салігорск — горад малады, таму глабальных праблем там няма», — лічыць Алена. «А Мазыру вельмі пашанцавала з горадаўтваральным прадпрыемствам, так што сітуацыя зусім нядрэнная», — дадае Іван. А вось Іван з Маладзечна настроены не настолькі аптымістычна: у гэтым населеным пункце ўжо даўно востра стаіць пытанне з працоўнымі месцамі, якое неабходна вырашыць у найбліжэйшы час. «Так, — падхопліваюць аднакурснікі. — У цэлым гэта для ўсёй краіны важна, неабходна, каб у людзей была праца і каб яна дастойна аплачвалася».

Па словах **старшыні ўчастковай камісіі № 39 Савецкага раёна г. Мінска Міхаіла ЖУЛЕВІЧА,** асноўны паток выбаршчыкаў чакаецца якраз падчас датэрміновага галасавання. Старшыня адзначае, што сёлета студэнты праяўляюць сябе вельмі актыўна. Надаць падзеі святочную афарбоўку дапамагае ансамбль народных інструментаў, які выступае ў холе. А на нядзелю запланаваны турнір па шахматах і буфет, у якім будзе прадстаўлены шырокі асартымент прысмакаў.

Сам Міхаіл Іванавіч таксама збіраецца прагаласаваць датэрмінова. Першае, з чым ён звярнуўся б да абранага дэпутата, — уладкаванне больш зручнага пешаходнага перахода непадалёк ад свайго дома ў мікрараёне Сухарава. На думку старшыні камісіі, пачынаць вырашаць глабальныя пытанні трэба з малога.

**Дар'я КАСКО.**

## ХТО ЁН — АБРАННІК НАРОДА?

**Вольга КЛІМОВІЧ, г. Віцебск, аператар электроннага набору і вёрсткі камунальнага ўнітарнага прадпрыемства:**

— Добрага дэпутата я бачу адукаваным, камунікабельным, такім, які ўмее хутка прымаць рашэнні. Народны абраннік павінен быць здольны адстойваць інтарэсы і правы людзей. Бо галоўнае — умець пачуць, а не проста слухаць.

Накont праблемы, якая, на мой погляд, патрабуе ўвагі. Як маці маленькага дзіцяці, мяне хвалюе адсутнасць аўтобуснага прыпынку на вуліцы Карла Маркса. Менавіта аўтобуснага, таму што ў напрамку вакзала спыняюцца толькі маршрутныя таксі, у якіх з дзіцячай каляскай, зразумела, не ўціснешся.

**Марыя КАТОВІЧ, гандлёвы прадстаўнік кампаніі Estel:**

— Дэпутата, за якога я хацела б аддаць свой голас, бачу маладым сучасным чалавекам 30—35 гадоў, які да такога ўзросту ўжо займае кіруючую пасаду — гэта будзе сведчыць аб яго мэтанакіраванасці і працаздольнасці. Зразумела, з вышэйшай адукацыяй, прычым перавагай будзе эканамічная спецыяльнасць, бо ўменне кампетэнтна распараджацца бюджэтнымі сродкамі — адна з галоўных задач дэпутата. Гэты чалавек абавязкова павінен быць адказны і сумленны. Да таго ж, хацелася б, каб ён шчыра верыў у значнасць сваёй місіі і з усіх сіл імкнуўся зрабіць жыццё людзей даручанай яму акругі лепшым. Па рабоце я шмат часу праводжу за рулём, таму мяне непакоіць стан дарог. А ён, нягледзячы на тое што ў Беларусі на гэта не прынята скардзіцца, вымушае жадаць лепшага. У нас у двары буйную яму, нягледзячы на шматлікія скаргі, не латаюць ужо месяц! Яшчэ адно пытанне, актуальнае і для сталіцы, і для іншых населеных пунктаў — адсутнасць пляцовак для выгулу жывёл. Таксама мінчан турбуе работа паліклінік: не так даўно ў нашым раёне адкрылі новую, а вось многіх вузкіх урачоў-спецыялістаў так і не набралі...

**Алена ЛОБАЧ, настаўніца, аг. Дабраволя Свіслацкага раёна:**

— Я думаю, што будучы дэпутат павінен быць чалавекам з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, гатовым дзейнічаць «тут і цяпер», супрацоўнічаць з рознымі «слаямі» насельніцтва. Ён павінен свабодна кантактаваць і з простым працоўным чалавекам, і з кіраўніком вялікай арганізацыі. Свайму дэпутату я прапанавала б звярнуць увагу на паляпшэнне транспартных зносін паміж маленькімі вёскамі і раённым цэнтрам. Добра было б у нашай мясцовасці адкрыць новыя кавярні, уладкаваць месцы для адпачынку моладзі.

АСАБЛІВЫ ДЗЕНЬ

# КАНЦЭРТ, ГАНДАЛЬ І СУВЕНІРЫ НА ПАМЯЦЬ

## Карэспандэнт «МС» пацікавілася, чым будуць заахвочваць людзей падчас выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў у Слаўгарадскім раёне

**У аграгарадку Ржаўка наогул насельніцтва актыўнае. Такога, каб нехта ігнараваў выбары, ніколі не было. Для аграгарадка гэта вельмі важная падзея. Праходзіць яна ў будынку сельскага сацыяльна-культурнага цэнтра, у сценах якога размясціліся і ФАП, і аддзяленне сувязі, і пашывачны цэх, і праўленне мясцовай аграгаспадаркі, і зала для гледачоў на 200 месцаў.**

Здалёк бачна шыльду, якая паведамляе, што Ржаўскі выбарчы ўчастак № 15 знаходзіцца менавіта тут. Да знакавага дзяржаўнага мерапрыемства ўсё даўно ўжо падрыхтавана. У фае насупраць увахада — вялікі стэнд з графікамі, планамі, спісамі. На стале шмат неабходнай інфармацыі, папкі з прозвішчамі выбаршчыкаў, тэлефон. Падрыхтаваны нават лупы і ліхтарыкі, каб людзям было зручна вывучаць інфармацыю. Хоць у кабінках, кажуць, і без гэтага будзе добрае асвятленне.

Выбарчая камісія — людзі спрэс вопытныя і надзейныя. Старшыня — Валянціна Кухарава, загадчыца Ржаўскага ФАПа. На гэтай пасадзе яна ўпершыню, а наогул у выбарчых камісіях з 1992 года, а апошнім часам працавала намеснікам старшыні. Задача Валянціны Аляксандраўны — каардынаваць працэс. Прызнаецца, што кожнаму са сваіх калег па камісіі можа даверыцца. Усе яны жыхары Ржаўкі, пяцёра працуюць у мясцовай гаспадарцы ААТ «Прывольны-Агра».

> Усяго ў Ржаўцы жыве 354 чалавекі, 253 з іх прыйдуць 18 лютага галасаваць менавіта на гэты ўчастак. Да астатніх 10 (такая лічба была на 2 лютага), якім сёння за 80 гадоў, члены выбарчай камісіі завітаюць самі.

— Такога, каб нехта не прагаласаваў, у нас яшчэ не было, — сцвярджае Валянціна Кухарава. — Нават калі выбары адбываліся летам, у разгар палявых работ, людзі прыходзілі галасаваць яшчэ датэрмінова.

Гэтым разам стаіць задача выбраць дэпутатаў у абласны, раённы і сельскі Саветы. «Два чалавекі прэтэндуюць на абласны ўзровень, два — на раённы і па два на чатыры акругі нашага аграгарадка, — пералічвае Валянціна Аляксандраўна. — Мы ўжо абышлі кожны двор і ўручылі лістоўкі з інфармацыяй пра кандыдатаў у дэпутаты, запрасілі людзей на ўчастак. Калі нехта пачынаў гаварыць, што яму гэта не патрэбна або што «адзін голас пагоды не зробіць», тлумачылі, наколькі важнае гэта мерапрыемства. Нават калі чалавек асабіста нікога не абярэ, ён прадэманструе сваю пазіцыю.




**Старшыня Ржаўскага выбарчага ўчастка № 15 Валянціна КУХАРАВА і яе цёзка па прозвішчы сакратар Марына КУХАРАВА да выбараў гатовыя.**

Прыцягваць людзей чымсьці незвычайным у Ржаўцы не збіраюцца. Але пасля выканання грамадзянскага абавязку ў выбаршчыкаў будзе магчымасць наведаць канцэрт мастацкай самадзейнасці, які пакажуць мясцовыя артысты. Талентаў тут шмат і сярод дарослых, і сярод школьнікаў. І ахвотных паглядзець на іх выступленне таксама заўсёды дастаткова. Тут табе і касцюмы, і музыка, і настрой. Не выключана, што і выязны гандаль прыедзе са Слаўгарада — а тарты і піражныя там робяць выдатныя.

— У нас заўсёды выбары праходзяць урачыста — музыка, прыгожа апранутыя людзі, — кажа Валянціна Кухарава. — Усе грамадзяне добразычлівыя, скандалістаў і хуліганаў сярод іх няма. Але нават, калі такія і знойдуцца, іх будзе каму супакоіць: разам з намі вахту нясе і міліцыянер.

Сакратар выбарчай камісіі Марына Кухарава (цёзка па прозвішчы Валянціны Аляксандраўны), нягледзячы на маладосць, таксама не навічок у выбарчай камісіі, упершыню працавала ў 2008 годзе на выбарах дэпутатаў у парламент. Адзначае, што людзі да такіх мерапрыемстваў заўсёды ставяцца вельмі адказна.

— Яны ведаюць, куды ідуць, у іх нават пытанняў ніякіх не ўзнікае. Уся інфармацыя на стэндах. А вось калі на дом выязджаем, здараюцца невялічкія кур'ёзы. Бывае, спрабуюць і за стол пасадзіць, — усміхаецца яна.

— Наогул пажылыя людзі вельмі радуюцца, калі мы прыходзім, часам нават абдымаюць, цалуюць, — дадае Валянціна Кухарава. — Ім жа галоўнае зносіны!

Самая старэйшая выбаршчыца — Настасся Калёсная, 1924 года нараджэння, самастойна перасоўвацца не можа. Але заўсёды з нецярпеннем чакае членаў выбарчай камісіі.

Сёлета на ўчастак упершыню прыйдуць галасаваць двое выбаршчыкаў 1999 года нараджэння — Валянціна Глушко і Уладзіслаў Каржоў. Ім тут збіраюцца ўручыць сувеніры на памяць. Уладзіслаў ужо працуе ў гаспадарцы, а Валянціна вучыцца ў Магілёве, але прыедзе галасаваць у родную Ржаўку. З 2 лютага выбарчы ўчастак у Ржаўцы працуе пастаянна, людзей запрашаюць азнаёміцца са спісамі, праверыць, ці не прапусцілі там іх прозвішча. А з 13 лютага пачалося датэрміновае галасаванне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Таццяна БАБІЧАВА, старшыня Слаўгарадскай раённай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў раённага Савета дэпутатаў дваццаць восьмага склікання:**

— З 18 студзеня ў раёне актыўна праходзілі сустрэчы насельніцтва з кандыдатамі ў дэпутаты. Усяго ў раёне створана 16 выбарчых камісій. З 2 лютага ўсе яны працуюць пастаянна, можна па тэлефоне ўдакладніць любую звязаную з выбарамі інфармацыю. У тым ліку, калі не можаце самастойна прыйсці на ўчастак, можна запрасіць членаў камісіі, каб абслужылі ў дзень выбараў дома. Усе выбарчыя ўчасткі будуць забяспечаны неабходнай колькасцю транспарту. Калі спатрэбіцца, можам арганізаваць і падвоз выбаршчыкаў. Такое ў нас, дарэчы, раней ужо практыкавалася. Чакаецца, што ўдзел у выбарах прыме каля 10 тысяч чалавек.

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды сроком на 99 лет земельного участка г. Ельске

Организатор проведения аукциона – Ельский районный исполнительный комитет
Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: на право заключения договора аренды на земельный участок сроком на 99 лет.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462

| | Предмет аукциона | Целевое назначение | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Размер задатка, реквизиты платежного документа для перечисления денежных средств, (бел. руб.) | Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков (бел. руб.) | Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, землеустроительную документацию для ознакомления | Адрес и номер контактного телефона комиссии |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 321450100004001567 площадь 0,1786 га по адресу: г. Ельск, ул. 50 лет СССР (в районе ТЦ «Евроопт»). Ограничения в использовании земельного участка нет. Срок аренды 99 лет | Для строительства и обслуживания торгового центра (земельный участок для замещения объектов розничной торговли), код по классификации 1 16 03 | 10206,99 | 1020,70 на р/с местного бюджета Ельского района BY35AKBB36004160000450000000. ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400034803, задаток за право заключения договора аренды | 1997,12 | Землеустроительная служба Ельского районного исполнительного г. Ельск, ул. Дзержинского Ф.Э., д. 6 8 (02354) 20585 | г. Ельск, ул. Дзержинского Ф. Э., д. 6 8 (02354) 20585 |

Аукцион состоится **19 марта 2018 г. в 14.30 в малом зале Ельского районного исполнительного комитета, по адресу: г. Ельск, ул. Дзержинского Ф. Э., д. 6.**

**Прием документов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 12 марта 2018 года, кабинет 1.4.**

Для участия в аукционе на право заключения договора аренды земельного участка приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**Внести задаток (задатки) не позднее 19 марта 2018 года** в вышеуказанном размере согласно графе 5 таблицы.

**Представить в комиссию** по организации и проведению аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков Ельского районного исполнительного комитета **по адресу: г. Ельск, ул. Дзержинского, д. 6, кабинет 1.4** следующие **документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукционов (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляются:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Размер увеличения цены предмета аукциона (шаг аукциона) установлен 5 процентов от предыдущей цены, называемой аукционистом.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) в соответствии с условиями, предусмотренными решениями Ельского районного исполнительного комитет от 24.02.2014 г. № №100,101, обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения (о затратах, связанных с организацией и проведением аукциона, участники будут проинформированы перед началом аукциона), формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков;

заключить с Ельским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав, ограничений прав на земельный участок;

юридическому лицу в течение шести месяцев, а гражданину в течение одного года с момента возникновения права на земельный участок приступить к его занятию в соответствии с целью и условиями предоставления;

получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Ельского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительства объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные документацией.

В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть представлена рассрочка оплаты на право заключения договора аренды земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

# «Я па дзесяць разоў стукаў у дзверы»



**Аляксандр ЛАСМІНСКІ тройчы абіраўся дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета. Многія гродзенцы ведаюць яго як тэлежурналіста, стваральніка гарадскога тэлебачання. Цяпер ён — кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь, фотаклуба «Гродна», заслужаны журналіст Беларускага саюза журналістаў. А яшчэ Аляксандра Ласмінскага можна назваць сапраўдным гродзенцам, які любіць свой горад, імкнецца раскрыць яго спадчыну і папулярызуе яго ў сваіх шматлікіх фотаальбомах і на выстаўках.**

***— Аляксандр Іосіфавіч, як пачынаўся ваш шлях у дэпутаты?***

— Неяк да мяне падышлі людзі і сказалі: давай, ідзі ў дэпутаты. У цябе шмат цікавых ідэй, паспрабуй іх увасобіць. Прыгадалі гісторыю з аднаўленнем Аўгустоўскага канала, якім я займаўся, можа, 20 гадоў, у выніку ўдалося ўсё ж «прабіць» рэканструкцыю, рашэнне аб якой было падпісана Прэзідэнтам. Праўда, гэтаму спрыяла і мая журналісцкая дзейнасць...

Мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты адразу некалькі вялікіх працоўных калектываў, і я адчуваў адказнасць перад імі. А калі абралі дэпутатам, адразу даручылі ўзначаліць пастаянную камісію па культуры, адукацыі і справах моладзі. Зразумела, пачаў думаць: а што я магу зрабіць для горада? Я не збіраўся проста адседжвацца на сесіях, мне хацелася зрабіць нешта карыснае для горада, унесці нешта сваё. Тым больш што я ведаў гісторыю горада, а з цягам часу гэтыя веды пашыраліся. Узнікла ідэя замацаваць за Гродnам статус горада-музея. З часам гэтая назва прыжылася.

***— І з чаго вы пачалі?***

— У горадзе існавала праграма «Спадчына», але яна была слабая, з-за адсутнасці фінансавання амаль не працавала. Разам з тым у Гродна пачалі прыязджаць турысты, і мы, дэпутаты, стараліся зрабіць так, каб улад неабходнасць развіваць гэты кірунак. Напрыклад, больш стварыць невялічкіх музеяў. Мяне заўсёды яны ўражвалі. Патэнцыял у нас велізарны. Толькі ў Замкавых музейных фондах знаходзіцца 200 тысяч каштоўных экспанатаў. Напрыклад, у літоўскім Шаўлях я некалі бачыў музей тэлевізараў (усяго адным пакоі — тады іх было мала), а побач музей веласіпедаў і музей фатаграфіі. Цікава? Цікава. У нас такіх невялічкіх музеяў не было. Ніхто гэтым асабліва не займаўся. Мабыць, таму, што раней у нас была арыентацыя на вывязны турызм. Турфірмы запрашалі наведаць што хочаце, толькі не свой горад... Але, напрыклад, ідэя стварэння музея нумізматыкі ўперлася ў праблему ўласнасці. Фонды музея абласныя, а памяшканне — гарадская ўласнасць. Трэба вышукваць сродкі на рамонт, калі мы хочам прыстасаваць гістарычную старую пабудову. А між тым не толькі манеты, але і сотні самавараў, лямпаў, грамафонаў пыляцца ў фондах, а маглі б стаць музейнымі экспанатамі. Ці музей фатаграфіі, выкананы ў выглядзе фотаатэлье пачатку XX стагоддзя. Можна пашырыць музей-аптэку, лічу ндрэнна стварыць музей гісторыі гродзенскай мэрыі. Зараз узнікаюць прыватныя музеі, напрыклад побыту ці музей праса. Так што ідэя гэта пацяху развіваецца.

***— Чаго канкрэтна ўдалося дабіцца падчас дэпутацкай дзейнасці?***

— Я вельмі ганаруся нашай жамчужынай XII стагоддзя — Каложскай царквой. Калі мяне абралі першы раз дэпутатам, думаў: што магу зрабіць для яе рочкі? Часта спрабаваў сябе ў якасці экскурсавода і неяк падчас прыезду дэлегацыі з падмаскоўных Хімкаў расказаў пра ікону Каложскай Божай Маці, якая была вывезена ў Расію і бясследна знікла пасля Першай сусветнай вайны. Дык вось, кіраўніцтва падмаскоўнага горада пры дапамозе Патрыярха зрабіла новы спіс іконы, які нам падарылі. Адбылося яе ўрачыстае ўнясенне ў храм.

Таксама падчас першага склікання ўдалося адкрыць сучасную выставачную залу. Такое памяшканне было па вуліцы Ажэшкі, але існавала ў закінутым стане. Стаяла задача — перавесці яго ў гарадскую ўласнасць, адрамантаваць, зрабіць не горш за еўрапейскія залы. З гэтай задачай мы справіліся. На пасаду дырэктара запрасілі прафесійнага мастацтвазнаўцу Ірыну Сільвановіч. Яна і зараз тут працуе.

***— Мабыць, і другое ваша скліканне было адметным?***

— У гэты час удалося зрабіць даступнай для наведвальнікаў нашу славутасць — старажытную пажарную каланчу. Раней, каб трапіць на аглядную пляцоўку, трэба было спачатку падняцца па прыстаўной лесвіцы, а затым — на самы верх. Была думка зрабіць у вежы музей гісторыі пажарнай справы Гродна. Першы, з кім я сутыкнуўся, быў начальнік абласнога ўпраўлення МНС тых часоў. Ён адразу заявіў, што нічога рабіць не будзе, бо няма грошай. Праз тры гады прыйшоў новы начальнік, які захапіўся відам, што адкрыўся з вышыні птушынага палёту, а праз месяц патэлефанаваў і сказаў: знайшоў сродкі на лесвіцу і музей. Цяпер гэты музей — адзін з найлепшых у краіне. А на пажарнай вежы кожны дзень апоўдні трубач іграе беларускую мелодыю... Ужо падчас трэццяга склікання з'явілася мара зрабіць у кожным падвальчыку ў цэнтры Гродна невялічкія кафэ, як у Вільнюсе, напрыклад. І вось я літаральна за руку пацягнуў мэра і іншых кіраўнікоў «у экспедыцыю» па сутарэннях Савецкай вуліцы. У адным з іх пазней узнікла кафэ «Раскоша». Таксама ўжо зроблены эскізны праект, каб далучыць да кафэ яшчэ і двухпавярховы падвал побач. Такія сутарэнні мы бачылі ў Вроцлаве. Улады пакуль ад гэтага адбіваюцца, — маўляў, некаторыя з іх засыпаны, хто за гэта возьмецца? Але яны амаль усюды былі засыпаны, іх раскапалі і прыстасавалі, і туды з задавальненнем заходзяць турысты.



***— Работа дэпутата патрабуе шмат намаганняў?***

— Можна, канешне, і адседзецца, як гэта часам і адбываецца. Але ў чым тады сэнс нашага дэпутацтва? Да таго ж ёсць закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, дзе ў плане заканадаўчай ініцыятывы многае можна зрабіць. Я браўся за тыя рэчы, якія, на першы погляд, здаваліся немагчымымі, і дабіваўся свайго.

***— Што было самым цяжкім падчас увасаблення вашых дэпутацкіх ініцыятыў?***

— Мяне часам здзіўляла і непакоіла абыякавасць некаторых чыноўнікаў ды і іншых дэпутатаў. Не ўсе аднолькава спрыяльна ставіліся да гэтых ініцыятыў. Бывала, што некаторыя паглядалі скоса, гэта выклікала ў іх раздражненне.

***— З якімі яшчэ пытаннямі звярталіся выбаршчыкі?***

— Падчас прыёму людзі прыходзілі з рознымі пытаннямі. Адны скардзіліся на тое, што дрэвы аварыйныя растуць у двары, другія, наадварот, на тое, што дрэвы спілоўваюць, трэба больш іх пасадзіць. Дзесьці дваровую тэрыторыю прасілі прывесці ў парадак, каналізацыю пракласці ў аднапавярховай забудове. І мы гэтага дабіваліся. Дрэвы падпілоўвалі часткова, я не быў прыхільнікам зносу дрэў. Дарэчы, падчас дэпутацтва былі створаны камітэты тэрытарыяльнага самакіравання ва ўсіх ЖЭСах, — каб аператыўна вырашаць усе пытанні жыхароў.

***— На ваш погляд, якія якасці неабходныя дэпутату?***

— Некаторыя кажуць, што ў мяне настырны характар. І сапраўды, каб вырашыць адно пытанне, я гатовы дзесяць разоў патэлефанаваць альбо адчыніць дзверы ў высокі кабінет. А без настойлівасці немагчыма дабіцца рэальных вынікаў. І новым дэпутатам мясцовай улады я таксама прапаную быць ініцыятыўнымі і настырнымі. Выбаршчыкі ацэняць гэта.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Аляксандра ЛАСМІНСКАГА.**

УСЁ Ў ПАРАДКУ

# За алеяй ліхтароў — алея крэатыўных лавак

**З кожным годам горад Жодзіна прыгажэе, тут з'яўляюцца новыя аб'екты, малыя архітэктурныя формы, якіх да нядаўняга часу не хапала. Яны надаюць гораду свой, непаўторны каларыт, робяць яго пазнавальным і адметным сярод іншых населеных пунктаў. У прыватнасці, летась на праспекце Міру з'явілася алея ліхтароў.**

— Распрацоўкай эскізаў і ўстаноўкай займаліся прадпрыемствы, а пляцоўку парадкавалі за кошт гарадскога бюджэту, — расказаў **першы намеснік старшыні гарвыканкама Сяргей КОНАН.** — Кожны з ліхтароў адлюстроўвае дзейнасць канкрэтнага прадпрыемства, арганізацыі, з'яўляецца эксклюзіўным і ўнікальным па сваім дызайне.

Напачатку ліхтароў было 24, а цяпер іх ужо 31.

Сапраўды, алея ўражвае. Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, тут хапае цікаўных, у тым ліку і дзяцей. У наведнікаў разбягаюцца вочы, бо вызначыць, які ліхтар лепшы, вельмі цяжка. Напрыклад, скульптурны ансамбль камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «ЖодзінаЖылЦеплаСэрвіс» атаясамліваецца з цяплом і ўтульнасцю ў доме. Кампазіцыя зроблена ў выглядзе хатняга кутка: крэслакачалка, за акном віднеюцца зоркі на небе, свецяць ліхтары. Пры праектаванні крэсла атрымалася вельмі ўмяшчальным, таму стваральнікі вырашылі зрабіць яго яшчэ і скарбонкай, пад якой знаходзіцца люк з кодавым замком. Лічыцца, калі ў спецыяльную шчыліну кінуць манетку, то жаданне спраўдзіцца. Пасля таго як скарбонка запоўніцца, яе адчыняюць, а грошы перадаюць на дабрачынныя мэты.

Жодзінскі хлебазавод устанавіў ліхтар у форме печкі з батонам унутры. Побач — фігура пекара з паднятым угору вялікім пальцам. Гэты жэст азначае: хлеб атрымаўся што трэба.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Світанак» працоўцы ў асноўным жанчыны. Ліхтар уяўляе сабой швейную машынку, за якую можа прысесці кожны ахвотны, каб сшыць сабе рэч.

Ліхтар БелАЗа назвалі «Волат». Гэта каваная стылізаваная скульптура: тры валы каркас з металічных пруткоў, да якіх прымацаваны пласціны з нержавеючай сталі. У кампазіцыі выкарыстаны таксама элементы дэталяў машын. Над галавой волата — валун з каляровымі шкельцамі і святлодыёдная падсветкай. Фігура асілка сімвалізуе магутнасць, а святло — стваральную мірную працу, пастаяннае ўдасканаленне.

А сёлета ў горадзе плануюць зрабіць яшчэ і алею крэатыўных лавак на праспекце Леніна. Працягнецца добраўпарадкаванне гарадскога парку — тут будзе невялікае возера, а пасярэдзіне — востраў з фантанам. Прадпрымальнікі ўладкоўць спартыўную пляцоўку, дзе цэнтральнае месца зойме карабель.

— Вядома, такія канструкцыі ўсталяваны ў розных кутках Беларусі. Але наша будзе спецыфічнай, унікальнай, непадобнай на іншыя, — упэўнены Сяргей Конан. — Акрамя таго, у мінулым годзе ўзнікла ідэя ўстанавіць ва ўездзе ў горад скульптуру Божай Маці, выява якой размешчана на гербе Жодзіна.



Вось так выглядае адзін з ліхтароў.

Сёлета БелАЗ адзначае 70-гадовы юбілей. Мяркуецца стварыць алею прадпрыемства «Кантыненты» з пазначэннем краін, куды пастаўляюцца і дзе працуюць айчынныя кар'ерныя самазвалы. Фарміраванне такога ўнікальнага асяроддзя, напоўненага жыццём, будзе весціся з удзелам арганізацый розных формаў уласнасці, прадпрымальнікаў, гараджан, а таксама з прыцягненнем сродкаў гарадскога бюджэту.

За мінулы год на вуліцах з'явілася столькі новых аб'ектаў, колькі не стварона за ўсю гісторыю горада. У гэтым вялікая заслуга старшыні гарвыканкама Юрыя Шарага, які можа пераканаць усіх кіраўнікоў прыняць удзел у добрай справе.

— Жодзіна па прыгажосці перасягнуў многія гарады, хоць пабудаваны пасля вайны. Менавіта дзякуючы малым архітэктурным формам ён набыў сваю адметнасць, — выказвае меркаванне **навуковы супрацоўнік Жодзінскага краязнаўчага музея Сяргей ВІЗНЕР.** — 2018 год вельмі важны для нас — ён чатыры разы юбілейны. У 1643-м паселішча было заснавана, у 1688-м атрымала назву Жодзіна, 70 гадоў таму быў заснаваны «БелАЗ». І, нарэшце, у 1963-м пасёлак гарадскога тыпу атрымаў статус горада абласнога падпарадкавання нароўні з Салігорскам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПАЧНІ З НУЛЯ

## Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, на што хапае субсідыі, калі хочаш распачаць уласную справу

**Быць беспрацоўным, мякка кажучы, непрыемна. Але калі ў вашым населеным пункце з працоўнымі месцамі зусім туга, можна паспрабаваць заняцца... бізнесам. Для гэтага сёння створылі больш прымальныя ўмовы. Да таго ж дзяржава згодна на першым этапе нават падмагчы — бязвыплатнай субсідыяй.**

### А бізнес-план ёсць?

Летась 310 жыхароў Магілёўскай вобласці атрымалі субсідыі на адкрыццё сваёй справы — на 13 больш, чым пазалетась. Аднаразовая бязвыплатная грашовая дапамога выдаецца беспрацоўнаму для частковай кампенсацыі яго фінансавых выдаткаў, звязаных з арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці. Закон дазваляе выкарыстоўваць субсідыю на набыццё абсталявання, інструменты, машыны і механізмы, сыравіну, матэрыялы, аплату паслуг і іншыя мэты, звязаныя з арганізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці. Памер субсідыі складае 11 бюджэтаў пражытковага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. З 1 лютага 2018 года БПМ (мяняецца кожны квартал) складае 199,32 рубля. Калі памножыць на 11, атрымаецца 2192,52 рубля. У сельскага насельніцтва ёсць магчымасць атрымаць крыху болей — 15 БПМ, або амаль тры тысячы рублёў.

> Каб атрымаць грошы, трэба перш за ўсё скласці і абараніць свой бізнес-план. Тыя, каму гэта цяжка зрабіць самастойна, праходзяць бясплатныя курсы.

— На субсідыю могуць разлічваць паўналетнія беспрацоўныя, якія стаяць на ўліку ў службе занятасці і на працягу месяца не змаглі працаўладкавацца, — інструктуе **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вольга Анатолеўна ХАДУСКІНА.** — Пры гэтым яны павінны не дапускаць парушэння закона аб занятасці і прымаць удзел у аплатных работах. Каб атрымаць грошы, трэба перш за ўсё скласці і абараніць свой бізнес-план. Тыя, каму гэта цяжка зрабіць самастойна, праходзяць бясплатныя курсы «Асновы бізнес-планавання» пры Магілёўскім МДУ імя Куляшова. Пасля зацвярджэння бізнес-плана выдзяляецца субсідыя, якая пералічваецца беспрацоўнаму на адкрыты банкаўскі рахунак. Яе ўладальнік павінен будзе выкарыстаць грошы выключна па мэтавым прызначэнні і на працягу трох месяцаў даць справаздачу.

### З педагога ў фларысты



Жыхарка аграгарадка Вейна Ірына Калбасава — педагог па адукацыі. Калісьці яна жыла ў іншай вобласці, працавала ў школе. Пасля пераезду паспытала шчасця ў адной з гасцініц Магілёва, але зарплата была малая. Калі ішла рэгістравацца на біржу, была ўпэўнена, што стане індывідуальным прадпрымальнікам і пачне гандляваць кветкамі — гэта ж так прыгожа, тым больш даводзілася і раней працаваць на рынку. З біржы накіравалі на двухтыднёвыя курсы па бізнес-планаванні ва ўніверсітэт імя А. Куляшова. Група набралася чалавек 20, але кожны быў настроены займацца сваім відам дзейнасці. Пад кіраўніцтвам куратара ўсе напісалі свае бізнес-планы. У райвыканкаме прэтэнзій да напісання не ўзнікла, Ірыніна заяўка на субсідыю была разгледжана ў 10-дзённы тэрмін, а на працягу месяца паступілі грошы — 15 БПМ як для жыхаркі сельскай мясцовасці. На той момант гэта складала дзесьці 2600 рублёў. Жанчына купіла стэлаж, стол, крэсла, фларыстычны набор інструментаў, тэрмінал. Ларок, касавае абсталяванне, халадзільнік яна набывала ўжо за свае грошы.

Наогул, субсідыю дазваляецца траціць толькі на тое, што прапісана ў бізнес-плане. Калі там ідзе размова пра, скажам, той жа фларыстычны нож, то іншы ўжо не прайшоў бы. Патрабуюць справаздачы за кожны рубель.

> Субсідыя пакрыла асноўныя выдаткі прыкладна на 30 %. Але Ірына ўпэўнена, што ўсё зрабіла правільна. Свая справа — гэта больш надзейна і творча. Хаця, прызнаецца, працаваць трэба пастаянна — тут склаўшы рукі не пасядзіш.

Асноўныя выдаткі — арэнда гандлёвай пляцоўкі пад ларок, падатак, электрычнасць, узносы ў пенсійны фонд. За месяц набягае больш за 400 рублёў, за год — каля пяці тысяч. Плюс 12 тысяч летась пайшло на закупку кветак. Гадавая выручка пры гэтым склала 24 672 рублі, кажа Ірына.

— Месячны заробак невялікі, але работа мне падабаецца, — канстатуе яна. — Я сама сабе гаспадыня. Ніякай папяратворчасці, толькі кніга касіра і журнал па ўліку расходаў і даходаў. І за субсідыю вельмі ўдзячна. Ну дзе б яшчэ я ўзяла грошы на тыя ж кветкі? А так мне іх, лічы, падарылі.

### Хобі стала прафесіяй



У Бабруйскім упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Святлану Ланскую ахарактарызавалі як шчаслівага чалавека, які сваё хобі ператварыў у прафесію. «Бачылі б вы, якую прыгажосць яна робіць са скуры», — «падагрэлі» спецыялісты маю цікавасць. І ні кроплі не перабольшылі. Нават не верыцца, што яшчэ тры гады таму Святлана гэтым не толькі не займалася, але нават і не цікавілася. Цяпер яна жыве мастацтвам.

— Часам лёс дорыць нам розныя падзеі, сустрэчы, якія кардынальна мяняюць наш погляд на многія рэчы. Дзякуючы ім мы вучымся абсалютна новаму, інакш мыслім, інакш дзейнічаем, — кажа мая суразмоўніца.

Усё пачалося пасля таго, як аднойчы яна схадзіла ў Бабруйску на выстаўку сваёй знакамітай зямлячкі Таццяны Карчажкінай. Яе карціны зачаравалі, уразілі і... натхнілі.

— Скура — вельмі жывы матэрыял, — кажа Святлана. — Аднойчы датыкнуўшыся да яго, зразумела — гэта назаўжды. Упрыгажэнні, кветкі, пано — я навучылася рабіць усё, нават прадметы найвялікшай складанасці.

Пра тое, як жыла раней, яна не любіць успамінаць. «Дзе толькі не працавала», — уздыхае Святлана. Але не натхнялі ні работа, ні зарплата. Прызнаецца, што, калі пайшла ў дэкрэтны водпуск, грашовай дапамогі хапіла толькі на дзіцячую каляску, і тое «б.у.». Не змагла працаўладкавацца і пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.

— Пасля наведвання выстаўкі я ў галаве пракручвала, наколькі рэальна гэтым займацца. Успомніла, што ў Бабруйску якраз скруралі завод ёсць і прыступіла да дзеяння, — усміхаецца яна.

Хутка, праўда, высветлілася, што справу сабе знайшла элітную. Матэрыял, фарбы, інструменты — усё гэта каштавала дорага, для работы спатрэбіліся не нейкія там адходы, а скура высокай якасці. А яшчэ не хапала ведаў. Пачала вучыцца, браць па інтэрнэце майстар-класы ў знакамітых майстроў. Грошы спатрэбіліся немаленькія. Але Святлана бачыла, што ў яе атрымліваецца, і не эканоміла.

— Зараз я адных толькі руж 25 відаў раблю, не ўлічваючы ўсяго астатняга, — прызнаецца яна. — Фарбы — японскія, скура — італьянская. Кошт, самі ўяўляеце які. Калі мне далі субсідыю, я амаль усю яе ўклала ў матэрыял.

> Спачатку баялася ўсіх гэтых таварна-транспартных накладных і чэкаў, але калі пачала працаваць, зразумела, што не так усё страшна.

У якасці рамесніка Святлана Ланская аформілася два гады таму. За гэты час навучылася не толькі віртуозна рабіць любыя рэчы са скуры, але і добра арыентавацца ў сваёй сферы. Даходы невялікія, бо ручная работа — гэта табе не канвеер. Тут трэба пасядзець над вырабам, «выняньчыць» яго.

— Спачатку нават прадаваць баялася, рэкламаваць, а зараз адчуваю сябе як рыба ў вадзе, — прызнаецца яна. — Вельмі ўдзячная за тую субсідыю. Яна мне дапамагла на першым этапе. Цяпер значна лягчэй. Ведаю, дзе шукаць кліентаў, як прадаваць свой тавар. Раз на раз не прыходзіцца, але зарабляю як сярэдні бабруйчанін. Хапае на тое, каб адной гадаваць двух дзяцей і плаціць за кватэру. Вядома, хацелася б большага. Але я добра разумею, што зараз усім няпроста. Калі людзі стануць багацейшыя і не будуць вырашаць, што ім лепш купіць — хлеб або брошку, тады і мае справы палепшацца.

### Крама моднага адзення



У магіляўчанкі Аляксандры Градавай цяпер у горадзе ёсць свая ўласная крама адзення. Гэта пакуль што кавалачак месца ў буйным гандлёвым цэнтры, але яна яшчэ ў самым пачатку сваёй прыватнай працоўнай дзейнасці. Індывідуальным прадпрымальнікам Аляксандра з'яўляецца усяго два месяцы.

— Пасля заканчэння ўніверсітэта адпрацавала неабходны тэрмін на заводзе ў якасці інжынера, але ўжо тады зразумела, што гэта не маё, — прызнаецца дзяўчына. — Пра тое, што пры адкрыцці сваёй справы можна разлічваць на дапамогу, ведала. Таму, калі засталася без працы, адразу ж адправілася ў службу занятасці. Бізнес-план напісала сама, ніякія курсы для гэтага мне не спатрэбіліся. Праўда, некалькі разоў давялося яго перарабляць, каб нарэшце зацвердзілі. Субсідыю далі даволі хутка, але яе хапіла толькі працэнтаў на 20 ад таго, што мне было неабходна для справы. Ільвіная доля сродкаў пайшла на закупку тэрмінала — 930 рублёў. Плюс заплаціла за першы месяц арэнды. На тое, каб даць справаздачу па субсідыі, даецца тры месяцы. Але я зрабіла гэта адразу ж, як толькі закупіла тавар. Спачатку баялася ўсіх гэтых таварна-транспартных накладных і чэкаў, але калі пачала працаваць, зразумела, што не так усё страшна. Тым больш што бяру я выключна беларускі тавар, а ў вытворцаў на яго ўсе неабходныя дакументы ёсць.

Аляксандра дэманструе сімпатычныя сукенкі, джэмперы, спадніцы брэсцкіх і гродзенскіх вытворцаў. Мадэлі сучасныя, а цэны даступныя. Пакупнікоў зараз няшмат, але ў снежні, кажа прадпрымальніца-пачатковец, — іх было дастаткова.

> — Стаж у мяне невялікі, але адчуванне, што не памылілася, ёсць, — прызнаецца Аляксандра. — Не ведаю, як далей будуць складвацца справы, але вяртацца на вытворчасць не збіраюся. На гэтым месцы я адчуваю сябе камфортна. Тым больш умовы для вядзення сваёй справы зараз больш чым спрыяльныя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008.** **Нумар падпісаны ў 19.30 15 лютага 2018 года.**